Анатоль Кудравец



...ніколі ня трэба вяртацца

ў сады сваёй маладосьці...

# Разьвітаньне

***Аповесьць***

*Прысьвячаецца студэнтам*
*Слуцкага педвучылішча*

Што кінула яго ў гэтую паездку, Адам не хацеў бы тлумачыць нікому. Нават сабе. Хаця сабе ён мог растлумачыць усё. Яму стала страшна. Ён зразумеў, што застаўся адзін на ўсім гэтым сьвеце. Зямля вялікая, кругом людзі, а яго сарвала, як карабель з якару ў час буры, і нясе ў невядомасьць. Хаця чаму ў невядомасьць? Невядомасьць – гэта няведаньне, а ён ведае...

Чалавек, колькі б гадоў яму ні было, да канца дзён сваіх застаецца наіўным дзіцем. Яму хочацца верыць у ілюзію, што трэба толькі зайсьці за лес, які сінее ўдалечыні, і ўбачыш край, дзе неба сыходзіцца з зямлёй. І абавязкова хочацца зазірнуць за той край, падзівіцца, што там. І хаця, чым бліжэй падыходзіш – неба адступае далей, жаданьне гэтае не прападае. Адам

зазірнуў за край свайго неба і ўбачыў, што там, акрамя чарнаты, нічога няма. І ён сам-насам з гэтай чарнатой. Як дурань у полі. І ніхто ня можа дапамагчы. Хоць вешайся. І вешаюцца...

Вунь Мікола, іхні сусед. Дзядзька Мікола, дзядзька Мікола... Цэлы месяц насіў вяроўку ў кішэні і запіску. Набіраўся сьмеласьці. Сьмеласьці на што? Павесіцца! Раптам дазнаўся, што грошы, якія ён зьбіраў на новую хату, рубель да рубля, капейка да капейкі, жонка з дачушкай прафукалі. Дачушка гуляла, жонка пасабляла. Было, што і яму вінца перападала. "Ідзі, Міколка, дачка прыехала, выпі з намі". Напаілі... Месяц хадзіў учарнелы, сам ня свой, маўчаў. А пасьля рашыўся: пайшоў у хлеў, перакінуў вяроўку цераз пярэчку ў кроквіне – і гатоў. Прыйшла Зося даіць карову, а ён вісіць, як маятнік у гадзіньніку, і язык паказвае. Падняла крык, учапілася за ногі, каб аслабіць пятлю, а ногі ўжо халодныя. Крычы не крычы: позна. Трэба было раней крычаць. На памяць пакінуў запіску: "Думаў пабудаваць новую хату, ды вы гэта зрабілі за мяне". І праўда: яму думаць ужо ні пра што ня трэба было. Калі дуга перахапіла горла, думаць позна. Людзі і хату збудавалі, і крыж паставілі.

Ці крычаў бы хто па табе? Хіба што Паўлік? Той крычаў бы. Ды што ён разумее, малеча... Зразумее пасьля. І жонка зразумее... Пасьля...

Сухі бетон мякка клаўся пад колы. Неба шэрым полагам абвісала над дарогай, але стрыжы насіліся высока, абяцаючы недажджлівы дзень. Праўда, і радыё дакляравала "пераменную воблачнасьць без істотных ападкаў".

Адам даўно звыкся з месцам за рулём, яно нібыта стала тым жа рабочым месцам, як і месца за сталом, за якім правяраў сшыткі. Ехаў, механічна робячы тое, што прасілі дарога і машына. Паслухмяная кожнай Адамавай думцы "Ніва" лёгка абганяла грузавікі, аўтобусы. Здавалася, яны нікуды не сьпяшаліся, ішлі сваёй разьмеранай, некім заведзенай хуткасьцю – шырокія, масіўныя, неўвароткія. Наперадзе квадратнай махінай ішоў рэфрыжэратар. Як лёг на асявую лінію, так і ня злазіў з яе. Чалавек за рулём рэфрыжэратара добра бачыў, што "Ніва" падпірае, просіць дарогу, але ішоў сваім ходам. На прамым чыстым участку Адам абышоў рэфрыжэратар справа, выскачыўшы за лінію бетону. Шафёр сустрэчанага "мерседэса" пакруціў пальцам ля скроні, махнуўшы рукой назад. Сьпідометр паказваў пад сто. Адам скінуў газ.

І тут, за першым жа паваротам, убачыў некалькі легкавых машынаў на ўзбочыне, "газік" на бетоне, людзей ля яго. Прыткнуўся ля крайняй машыны, пайшоў наперад.

Усё было проста: чалавек бег цераз шашу на другі бок дарогі. "Газік" вылецеў з-за павароту, насустрач яму ішоў "МАЗ" з прычэпам, справа на траве стаяў трактар. "Газік" мог ці ўрэзацца ў трактар, ці ў лоб "МАЗу", ці праскочыць у шчыліну паміж імі. Ён так і пайшоў. І тут з-за трактара выскачыў гэты чалавек.

Цяпер ён ляжаў распластаны, галавой на белай паласе асявой лініі. У камбінезоне, ногі ў кірзавых ботах крыж-накрыж. Жоўтая, нібы разрэзаная бульбіна, рука, галава ў лужыне крыві.

– Усё? – спытаў, падыходзячы, Адам.

– Усё, – адказаў яму нехта.

Павінуючыся незразумелай цікаўнасьці, Адам прысеў ля чалавека, узяў

вялую жоўтую руку – пашчупаць пульс. Пульс не праслухоўваўся. Чалавек быў мёртвы.

Ён ужо ніколі ня ўстане, ня прыйдзе дамоў, нікому не ўсьміхнецца. Яго ўжо няма. Ён ляжыць тут, і яго ўжо н я м а. Некуды сьпяшаўся, пра нешта марыў, прыкідваў планы і вось...

Самае паганае ў прафесіях доктара і настаўніка, што прафесія адбірае ілюзіі. Адбірае невядомасьць – тое, на чым трымаецца надзея чалавека, ягонае заўтра, ягонае неба, на якое чалавек моліцца нават калі і ня ведае Бога. Доктар лечыць цела, настаўнік – душу, але і той і той раскладвае чалавека па костачках: што чаму, што да чаго. Адам быў настаўнікам.

Асьцярожна, як жывую, Адам паклаў руку на асфальт і раптам усім целам, усёй істотай адчуў холад пустаты вакол сябе, адчуў, што кругом яго нікога няма. Узьняў галаву: на шашы былі толькі мёртвы і ён. Кінуў позірк налева – голая прастора, павярнуў галаву ўправа і ўбачыў, як на яго, засланяючы цёмнай тушай увесь прагал дарогі, ляціць рэфрыжэратар. Незразумелая сіла, як спружына, распраміла Адамава цела і кінула ўбок з бетонкі. Падаючы на зямлю, пачуў тугую цёплую хвалю, якая, як брызентам, хляснула па твары, па руках. Убачыў, што колы рэфрыжэратара прайшлі абапал нерухома распасцёртага цела, і ўсьлед за машынай, як кацёлка, пакацілася чорная круглая шапка забітага.

Рэфрыжэратар спыніўся метраў праз сто. Гэта была тая машына, якую Адам нядаўна абагнаў. З кабіныываліўся шафёр з пабялелым тварам, кінуўся да месца трагедыі. Падбягаў бліжэй – запавольваў крок. Кроў прылівала да шчок па меры таго, як пераконваўся, што ўсе, хто стаяў, стаяць жывыя, і чалавек, што ляжаў на шашы, ляжыць на тым жа месцы. Вярнуўся назад, падняў шапку, прынёс, паклаў ля галавы забітага, выцер пот з ілба.

– Куды цябе гоніць? – спытаў у яго нехта, паказаўшы вачамі на забітага. Шафёр нічога не адказаў. Усе моўчкі глядзелі на Адама, які ўстаў з зямлі і атрасаў калашыны штаноў. Атрос, зірнуў на шафёра рэфрыжэратара, паківаў галавой і пайшоў да сваёй машыны. Сеў за руль і доўга ня мог патрапіць ключом у замок – трэслася рука. Завёў машыну, праехаў па шашы, зьехаў уніз на вузкую лясную дарогу. Ехаў, пакуль ня стала цёмна ад навісі галінаў. Спыніў машыну, узьлёг на руль. Пазіраў перад сабой, туды, дзе ў зялёным паўзмроку гублялася дарога. Сядзеў у нейкім здранцьвеньні, з пустатой у галаве і на душы. Ніяк ня мог супакоіцца. Дзівіўся сам з сябе: чаго так спалохаўся? Сьмерці? Колькі думаў пра яе як пра непазьбежнасьць, якая павінна прыйсьці і, відаць, у самым недалёкім часе. Вунь яна, стаіць за вуглом, чакае. Думаў спакойна, звыкся з гэтай думкай, а тут спалохаўся. Няўжо гэтак заўсёды: думкі пра сьмерць – адно, а сама сьмерць – зусім іншае. Як ён сігануў з шашы! Калі б усю гэтую карцінку зазьняць на кінаплёнку – цікавейшыя кадры былі б! Во можна было б пасьмяяцца!

І засьмяяўся – халодным нутраным сьмехам. Чужым сьмехам.

Гэты чалавек на шашы... Яго і мёртвага не хацелі пакінуць у спакоі. Быццам хацелі забіць другі раз. Выходзіць, ён абавязкова павінен быў памерці, ня ў першы, дык у другі раз. А можа, цяпер павінен быў памерці Адам? Навошта мёртваму паміраць другі раз? Канешне, цяпер павінен быў памерці Адам. Рэфрыжэратар з самага пачатку не хацеў даваць яму дарогу. Нібы падначваў на рызыкоўны абгон, а можа, і на аварыю. Потым

гэты шалёны наезд... Нейкая доля секунды – і Адам ляжаў бы побач з чалавекам у кірзавых ботах. Ці далёка наперадзе... Але не ляжыць. Значыць, павінен быў застацца яшчэ пажыць...

Думкі пераскоквалі з аднаго на другое, але круціліся вакол толькі што пражытага... Адам не заўважыў, як задрамаў, і ня ведаў, колькі прабыў у трывожным бяспамяцтве. Ачнуўся ад таго, што нешта стукнула па версе машыны. Адчыніў дзверцы, – нідзе нікога і нічога. Відаць, зьязджае з капылоў, нешта мроіцца, нешта чуецца... Выйшаў з машыны, пайшоў па дарозе. Які змрочны дзікі лес, колькі таго ад'ехаў з бетонкі, а такая старына. Павярнуў да машыны і зноў пачуў, як нешта шпокнула. Узьняў галаву ўгору: высока на сасьне, распушыўшы хвост, весела гайдалася вавёрка. Якраз над машынай. Відаць, забаўлялася з шышкай і ўпусьціла, ці сучок які адваліўся. Адам сумна ўсьміхнуўся: вось так людзі і запісваюцца ў ненармальныя – з імі жартуюць, а яны не разумеюць жартаў.

Сеў у машыну, праехаў наперад, знайшоў прасторнае месца, разьвярнуўся, выехаў з лесу на палявую дарогу, не дарогу – дзьве белыя паласы ад колаў, між імі – зялёная трава, справа і зьлева жыта.

Зусім распагодзілася. Добра прыгравала сонца. Сустрэўся масток, плыткая рэчка. Зьвярнуў з дарогі на прырэчны лужок, спыніўся, спусьціўся да рэчкі. Рэчка была нешырокая, можа, метры тры-чатыры, але вада чыстая і гнала яе добра – ля берага матлялася, зьвіваючыся зьмейкамі, каляная бліскучая асочка. На дне там-сям ляжалі невялікія камяні, блішчалі масьлянай чарнатой, быццам былі пакрытыя лакам. Над імі плынь несла лёгкія парушынкі. Цені ад хваляў стракацелі на камянях, рабілі іх рухомымі, нібыта жывымі.

У асочцы ўбачыў паласата-зялёнага шчупачка – тонкага, вастраносага. Ён стаяў нерухома, вяла варушачы хвастом, – ці то хвост, ці перына асочкі, па ўсім, пільнаваў сваю здабычу. Цень ад воблачка, што на хвіліну схавала сонца, ці нешта іншае спалохала прыгожага разбойніка, і ён вільнуў з засады, дадаўшы новых хваляў на вадзе.

Адам распрануўся, залез у ваду. Ля берагу было мелка, трохі вышэй каленяў. Знайшоў глыбейшае месца, і хоць вады было там толькі па пояс, лёг на сьпіну, упёршыся рукамі ў пясчанае дно. Вада была мяккая, мылкая, і Адам ляжаў, слухаючы, як яна прыемна абцякае, лашчыць цела. Хацелася ні пра што ня думаць. Але ні пра што ня думаць не атрымлівалася. Думкі былі, можа, ня думкі, а асколкі думак, нейкія іскры, усё гэта зьбілася ў нешта цяжкое і каменем сядзела ў грудзях. І адчуваньне, нібы ў ім адначасова жылі два розныя чалавекі – адзін жыў, думаў, яму нешта рупіла, а другі, як робат, з халодным спакоем назіраў за першым. Думкі круціліся вакол аднаго: дыягназу, пра які яму нарэшце сказалі. І сказаў ня хто іншы, а яго ж сябра, хірург, добры хірург. Некалі яны канчалі адну сямігодку, было, што сядзелі за адной партай, пасьля іхнія дарогі разышліся, а потым зноў сышліся. Нібыта для таго, каб Адам змог пачуць ад яго: "Будзь мужны і прымі гэта як жорсткую зададзенасьць. Ёсьць такая хвароба веку і завецца яна кароткім словам: рак. І бывае, што ён неаперабельны. І не таму, што дыягназ пастаўлены позна, а таму што неаперабельны..."

Адам вылез з вады, абцёрся ручніком і кінуўся на траву. Была то дзяцеліна – маладая, пружыністая, з мядовым пчаліным пахам. І зноў забыўся трывожным сном. Ачнуўся хутка, але яшчэ доўга ляжаў, не расплюшчваючы вачэй, услухоўваючыся ў жыцьцё, што ішло кругом яго. І раптам

усёй істотай адчуў, што ён тут чужы, лішні. Вось ён ляжыць у нейкім неазначальна-няпэўным стане, ці то жывы, ці нежывы, а кругом яго – у вадзе, у траве, у небе – ідзе сваё жыцьцё, незалежнае ад яго, ад ягонага настрою, ад ягоных жаданьняў, і жыцьцю гэтаму ўсё роўна, ёсьць такі Адам на сьвеце ці няма, усё роўна, што ён думае, што зьбіраецца рабіць, і гэтае жыцьцё будзе працягвацца незалежна ад таго, будзе ён жыць на гэтым сьвеце, ці яго ня стане, як таго чалавека ў кірзавых ботах. Гэтак жа будуць сьпяваць жаўранкі, гэты ці іншы шчупак гэтак жа будзе пільнаваць сваю здабычу, вавёрка гэтак жа будзе церабіць шышкі... То адкуль гэты страх сьмерці, калі ты разумееш, што ты непатрэбны, лішні на гэтым сьвеце? Некалі быў патрэбны, ці проста думаў, што патрэбны, а цяпер... Чамусьці ўспомнілася даўняя летняя раніца, калі ён, студэнт педвучылішча, сышоў з цягніка на сваёй станцыі і пеша дабіраўся дамоў, а гэта было кіламетраў дванаццаць. Прайшоў ужо кіламетраў з дзесяць, зьвярнуў на палявую сьцежку цераз жытняе поле, яна спрамляла шлях, і раптам адчуў такую страшэнную стомленасьць, і так пацягнула на сон, што ён ня вытрымаў, знайшоў першы ўтравелы гурбяк, лёг на яго і адразу заснуў. Была позьняя раніца, да дому заставалася нейкіх паўтара кіламетра, кругом было жытняе поле, над галавой сьпелае неба і жаўранкі са сваімі шчымлівымі галасамі, а ён спаў. Колькі праспаў – ня ведае, але прачнуўся бадзёры і радасны, адкрыты жыцьцю, усё сьпявала ў ім, як сьпявала кругом у прыродзе.

Як гэта было даўно! А можа, і не было ніколі, можа, гэта яму толькі цяпер прытрызьнілася – такая вялікая разьбежка была паміж той раніцай і гэтым днём. Тады ён ехаў дамоў, яго чакала мама, браты, сваё сяло і ўсё сваё, а цяпер ён выбраўся з дому ў дарогу, задачы якой ня ведае. Хаця чаму ня ведае? Ведае, добра ведае. Таму і сеў за руль, і паехаў... Колькі гадоў ляжала між тым і сёньняшнім днём – дзесяць, дваццаць? Не, не гады ляжалі між імі – цэлае жыцьцё, яго жыцьцё. Тады ўсё было наперадзе, цяпер – усё ў мінулым. Усё? А сын?.. Сын. Сынок... Сын не прападзе... Маці прыгледзіць, а калі што – бабуля. Хаця яму цяжка будзе бяз бацькі прывыкаць да гэтага сьвету.

І зноў машына ішла па шашы, і зноў Адам сядзеў за рулём. На вуснах ягоных блукала ўсьмешка. Было ў ёй нешта жорсткае і дзіцячае, усё гэта мянялася месцамі, адно пераходзіла ў другое, вяло барацьбу між сабой. І вочы ягоныя пазіралі затраўлена-сумна, быццам ім адкрылася таямніца, пра якую ўсе здагадваюцца, але якой ня ведае ніхто.

Высока ў небе ледзь бачны самалёт цягнуў белую нітку-павуцінку, цягнуў павольна, быццам яна была страшэнна цяжкой. Адам падумаў, што вось так кожны чалавек цягне за сабой сваю нітку-жыцьцё. І чым болей чалавек жыве, тым даўжэе гэтая нітка і цяжэй яе цягнуць, і зусім няшмат трэба, каб яе перашчыкнуць. Тады самалёт пойдзе сабе, а нітка застанецца сабе, а пасьля ня стане ні самалёту, ні ніткі: яны зьнікнуць, размыюцца, як гэты дымны сьлед. І гэта ўсё?.. Нарадзіўся чалавек, прамільгнуў, як росчырк на чыстым небе, і ўсё? І нічога не засталося?..

На выезьдзе з вясковай дарогі стаяў трактар, чакаў, калі можна будзе пераехаць шашу. Трактарыст, зусім малады хлопец у шапачцы веласіпедыста, сьмяяўся. Побач з ім сядзела тоўстая, як капа, жанчына і таксама сьмяялася, і ўся аж трэслася ад сьмеху. Можна было падумаць, што гэта ад яе сьмеху трасецца маленькі “Беларус”, аж труба над ім падскоквае.

Думка гэтая ўзьнікла мімалётна і не закранула нічога ў Адаме, прайшла рыкашэтам, як куля ад бетоннай сьцяны.

На ўезьдзе ў горад пад маладзенькім таполікам хлапчук і дзяўчынка, відаць, брат з сястрычкай, прадавалі суніцы. Адам купіў шклянку ягадаў, хлапчук перасыпаў іх у ражок, згорнуты з ліста школьнага сшытка. Адам укінуў некалькі ягадзінаў у рот. Смаку не адчуў: ці то ягады былі недасьпелыя, ці то забыўся, што такое першыя суніцы.

У горадзе заехаў на прывакзальную плошчу. Ён некалі добра ведаў гэтую плошчу, ды і ня плошча гэта была некалі, а праезд да чыгуначнага вакзалу між аднапавярховых драўляных дамоў з гародамі, яблынямі і грушамі. Цяпер ён не пазнаў гэтае месца. Драўляныя дамы пазносілі, сады таксама, зямлю выраўнялі бульдозерамі, залілі асфальтам, толькі тамсям пакінулі дрэвы. Па левую руку плошчы стаяў новы – са шкла і бетону – прасторны аўтавакзал, па правую ўздымалася ўсё тая ж масіўная цагляная воданапорная вежа са старой знаёмай лічбай – “1949”. Адам паставіў машыну ў цяню вежы. Будынак чыгуначнага вакзала быў той жа і з той жа лічбай угары “1950”, трохі аблезлы і быццам ніжэйшы, як некалі. Вежу і вакзал будавалі адно за адным: спачатку стараліся даць ваду паравозам, а пасьля даць прытулак і людзям.

Было горача. Пахла нагрэтым асфальтам і бензінам, мітусіліся людзі, зьбіваючыся ў муравейнік ля аўтобусаў, недзе за вакзалам чахкаў паравоз. Гэтае чахканьне выклікала ў Адамавай памяці знаёмае і такое даўняе адчуваньне, вярнула да таго, што жыло недзе ўнутры, каб раптам прачнуцца, як мелодыя забытай песьні.

У самім вакзале Адаму нічога ня трэба было, але яго цягнула туды, усярэдзіну. З гэтым вакзалам у Адама было зьвязана вельмі шмат. То быў першы гарадскі чыгуначны вакзал, у які некалі ён зайшоў як паўнапраўны пасажыр. Тады ў яго шмат што было ўпершыню. Першы раз бачыў паравоз, першы раз ехаў у цягніку з маленькім прамавугольнічкам дарожнага білета, прабітага на сіцечка кампосьцерам кантралёра. Ехаў тады ў іхнім купэ цікавы вусаты мужчына, па ўсім, настаўнік, і калі даведаўся, што Адам хоча вучыцца на настаўніка, задаў яму хітрую задачку, паставіўшы цяжкую ўмову: “Рошыш – можна паступаць, ня рошыш – справа, хлопец, дрэнь”. І ў мужчыны, і ў Адама наперадзе было чатыры гадзіны дарогі, іх трэба было неяк прабавіць, і каб было весялей, ён падкінуў гэтую задачку. Адам запомніў яе на ўсё жыцьцё: “Мужык прывёз на кірмаш прадаваць курэй. Першаму пакупніку прадаў палову ўсіх курэй і паўкурыцы. Другому – палову тых, што засталіся, і зноў паўкурыцы. Трэцяму – палову тых, што засталіся, і паўкурыцы. На тым куры скончыліся. У задачы пытаецца: колькі курэй было ў мужыка пры ўмове, што курэй ён прадаваў жывымі?”. Для большае інтрыгі вусаты пасажыр сказаў, што такія задачкі рашалі вучні трэцягачацьвёртага класу старой дарэвалюцыйнай школы, Адам жа скончыў савецкую сямігодку... Пасажыр весела пасьміхаўся, пазіраючы на Адама. Адаму сьмяяцца не выпадала.

Цягнік барабаніў коламі, вагон гайдала з боку ўбок, за вакном праплывала чарната ночы ўперамешку з агнямі і мітусьнёй прыпынкаў, а Адам ламаў галаву, стараючыся рашыць мудроную задачку. Чатыры гадзіны – гэта шмат, і яны цягнуцца доўга, калі няма чаго рабіць, а калі трэба... прадаваць курэй, ды тром пакупнікам, ды каб куры былі жывыя...

Матэматыку Адам любіў, і давалася яна яму лёгка. Не было той за-

дачкі, якую б ён ня змог раскалоць, урэшце, “пахвальную грамату” за проста так не даюць, але то былі школьныя задачкі, а гэта была задачка не прывычна школьная, а з падвохам, у ёй была нейкая хітрынка, не разгадаўшы якую, ня знойдзеш правільнага адказу. Якая хітрынка, і дзе яна? У “палове”? Палове курэй і палове курыцы? Курэй мужык прадаваў жывымі, жывымі... Прадаў палову ўсіх і паўкурыцы, палову астатніх і паўкурыцы... Палову і паўкурыцы... І куры павінны заставацца жывымі. А каб куры заставаліся жывымі, ім ня трэба адкручваць галовы, скубсьці, а пасьля класьці на калоду і расьсякаць папалам. Няхай сабе бегаюць і нясуць яйкі. Апошняму пакупніку мужык прадаў... “палову тых курэй, што засталіся, і паўкурыцы”... Паўкурыцы, паўкурыцы... Значыць, паўкурыцы і ёсьць *палова* курэй, што заставаліся напасьледак, бо калі б іх было дзьве, без тапара не абысьціся... Значыць, апошняму пакупніку ён прадаў адну курыцу, адну жывую курыцу. Перадапошняму пакупніку мужык прадаў палову тых, што засталіся ад першага, і паўкурыцы – значыць, прадаў дзьве курыцы, а самаму першаму – чатыры. Нішто сабе купец!.. Спакойна, спакойна... Адам яшчэ раз пераправерыў рашэньне і з радасным трымценьнем недзе ў жываце пераканаўся: усё было правільна. Мужык прывёз на кірмаш сем курэй. Адам так і сказаў вусатаму пасажыру. “Маладзец, – з нейкай доляй зьдзіўленьня пахваліў той. – Задачка не такая і простая. Думаю, з цябе будзе толк...” – Памаўчаў і дадаў: “Дзярзай, хлопчык. Удачы табе”.

Пасажыр выйшаў з цягніка на сваёй станцыі, пакінуўшы Адама “дзярзаць”. Праз два прыпынкі была Адамава станцыя і гэты вакзал, куды Адам зайшоў разам з людзьмі, што высыпалі з вагонаў.

На адной з масіўных дубовых лавак з высокімі глухімі сьпінкамі, памечанымі літарамі “МПС” (пазьней Адам расшыфруе гэтае загадкавае “МПС” – министерство путей сообщения), лаўкі былі расстаўленыя паўз сьцены і па цэнтры залы, ён знайшоў вольны куток. Была позьняя ноч. Абняўшы сваю палатняную торбу-хатулёк, з якой мама выправіла ў дарогу, Адам адразу ж задрамаў, уздрыгваючы ад кожнага моцнага голасу: у высокай зале з вялізнай круглай люстрай пад стольлю ўсе гукі непамерна ўзмацняліся, аддаваліся гулкім рэхам. Папраўдзе ён заснуў недзе пад самую раніцу і прахапіўся ад роўнага глухога шуму і бразганьня вёдзер: гэта прыйшлі прыбіральшчыцы – мыць выкладзеную пліткамі ў карычневыя шашачкі падлогу, праціраць падваконьнікі, ручкі дзьвярэй, лаўкі.

Сонны пасьля неспакойнай дарожнай начы, ён выйшаў на цёмны ад сырасьці перон. Над рэйкамі блакітна сіцілася паветра, нязвычна-востра пахла выкінутым з топкі паравоза сьвежым вугальным шлакам. Удалечыні, за стрэлкамі, ля доўгіх драўляных баракаў весела бегаў манеўравы паравозік. Ён падаваў тонкі галасок “і-і-іх!”, на хвілінку спыняўся, каб зараз жа пабегчы ў другі канец пуцей. Паравозік нечым нагадваў Адаму парсючка, якога ён пасьвіў дома, як той бегаў з кутка ў куток у загарадцы, калі хацеў на волю. Адам глядзеў на гэты вясёлы паравозік, і яму самому стала весела. Ён чамусьці рашыў, што ўсё будзе добра, што ён абавязкова паступіць. Пра тое, як і што будзе далей, ён стараўся ня думаць.

Жанчыны скончылі работу і пайшлі са сваімі вёдрамі, куды-небудзь выбірацца было рана, і Адам вярнуўся на сваё месца на лаўцы, прысланіў галаву да сьпінкі пад літарамі “МПС” і адразу заснуў. І яму было добра ў сьне, нібыта ён быў дома, а не за многія кіламетры адтуль, і нішто яго

не турбавала. Калі прачнуўся, вакзал поўніўся людскім гулам, чарга была і ля касы, і ля буфета: вось-вось павінен быў прыйсьці цягнік на Баранавічы. Адам узяў свой хатуль, выйшаў на перон і пайшоў узбоч пуцей, па сьцежцы, чорнай ад паравознай сажы і катышоў шлаку, стараючыся не наступаць на іх босымі нагамі, –у той бок, дзе пуці перасякалі вуліцу, на якой, як яму сказалі, і быў яго будучы педтэхнікум. Сонца ўжо было высока, кругом віравала жыцьцё. Побач з чыгункай за дарогай стаялі драўляныя домікі – з дварамі, невялічкімі хлеўчукамі, садамі, акуратныя, пафарбаваныя, дагледжаныя – ня тое, што ў іхнім сяле. Пройдзе час і ён даведаецца, што гэта быў пасёлак чыгуначнікаў, што ў тых доміках жылі работнікі чыгункі, і зразумее: каб кожны дом, кожны двор быў дагледжаны і ўсё ў ім было даведзена да ладу, патрэбны былі і добрая капейка, і мужчынскія рукі, – тое, чаго ў іхнім сяле не было і што ўзяць не было адкуль. Але тое будзе пазьней, а цяпер ён пазіраў цікаўнымі вачамі на гэтыя, амаль такія ж, як і ў іхнім сяле, дамы, на платы з паразьвешанымі анучамі, рыбалоўнымі сеткамі, там-сям усторкнутымі гладышамі, і гэтае падабенства горада з іхнім сялом дадавала яму сьмеласьці і ўпэўненасьці. Праўда, калі ён дайшоў да пераезду і павярнуў налева паўз высокія і аграмадныя (так яму здавалася) трох– і чатырохпавярховыя дамы з чырвонай цэглы, гэтае падабенства пачало прападаць. Але адчуваньне, што ў яго ўсё будзе добра, не пакідала яго. На ўсё новае, гарадское ён глядзеў вачамі чалавека, якога быццам бы цяжка было нечым зьдзівіць.

За сваё жыцьцё ён бачыў ня надта шмат машынаў, – якія ў сяле машыны? – а ехаў на машыне ўсяго адзін раз і то стоячы ў кузаве, за кабінай, калі вазілі з вяскоўцамі здаваць падмерзлую бульбу на сьпіртзавод, а тут машыны сустракаліся самыя розныя – і палутаркі, і студабекеры, прабегла некалькі легкавушак, чмыхаючы над самай зямлёй дымам, – словам, было на што паглядзець, было чаму падзівіцца.

Ён ішоў па земляной, убітай многімі нагамі дарожцы, якую можна было назваць і тратуарам, людзі некуды сьпяшаліся, хто пераганяў яго, хто ішоў насустрач, кідалі позіркі на ягоныя босыя ногі, на палатняную торбачку за плячамі, і хуценька адводзілі вочы ўбок, быццам адчувалі за сабой нейкую віну ці нечага саромеліся. Але гэтыя позіркі ня надта трывожылі яго. Невядомая раней унутраная сьмеласьць падказвала яму, што ўсё вакол: і гэтыя высозныя дамы, і машыны, і гэтая дарожка, і людзі на ёй – усё гэта мае самае непасрэднае дачыненьне да яго, што ўсё гэта зьвязана з ім, што гэта ягонае новае жыцьцё. Гэтае адчуваньне ўзвышала яго, рабіла большым, дужэйшым. Не-не ды і ўспамінаўся вусаты пасажыр са сваёй мудронай задачкай пра курэй і ягоныя разьвітальныя словы пра ўдачу. І здавалася, нібыта ўдача ішла з Адамам, нібыта ён ужо і паступіў, і скончыў вучобу, і сапраўды быў настаўнікам. Зьдзівіла, што ля двухпавярховага будынку педвучылішча нікога не было. Чамусьці ён думаў, што людзей там павінна быць шмат, можа, столькі, як на вакзале. Цяжкія дубовыя дзьверы з саліднай меднай ручкай лёгка адчыніліся і прапусьцілі яго ў прахалодны паўзмрок калідору. Халадок ішоў ад масіўных, даўняй пабудовы цагляных сьценаў, нагам было прыемна на нядаўна памытай дашчанай падлозе. У калідоры было ціха.

Ён знайшоў кабінет, на дзьвярах якога было напісана: “Канцылярыя”, зайшоў. То была прыёмная дырэктара з дзьвярамі, якія вялі ў другі пакой і на якіх была другая строгая шыльда: “Дырэктар”.

Сакратарка – невысокенькая бабка з празрыста-сьветлымі вачамі – пасадзіла Адама на адно з крэслаў, што скупым радком стаялі паўз сьцяну, зірнула на паперку, якая запрашала Адама на прыёмныя экзамены, потым на скрынку насьценнага гадзіньніка, што вісеў на сьцяне перад ёй, ускінула рукамі:

– Дзе ты, хлопчык, так позна ходзіш? Усе ўжо даўно пайшлі пісаць дыктант...

Адам адчуў, як нешта гарачае шуганула яму ў галаву і пакацілася ўніз жывата і далей, у пяткі. Твар сакратаркі з прыветнага стаў няласкавым, вочы яе звузіліся і пацямнелі.

"Ну, во і паступіў. Во табе і кірмаш, і куры"... Нешта павяло ўбок. Адам учапіўся рукамі за крэсла, на якім сядзеў. "Што ты, хлопчык... На, выпі вадзічкі"... – данёсься аднекуль здаля трывожны спагадны голас. Адам узяў працягнутую шклянку, глынуў вады, глыбока ўздыхнуў... і зноў убачыў сакратарку за тым жа сталом і яе празрыста-сьветлыя вочы. У іх было спачуваньне, быццам гэта не Адам, а яна сама спазьнілася на той прыёмны дыктант.

– Што ж мне з табой рабіць? – сказала яна ціха і зноў кінула позірк на гадзіньнік.

Адам адчуў сябе лепей і не знайшоў нічога іншага, як ляпнуць:

– Калі ўжо запазьніўся, то аддавайце назад дакументы.

Відаць, толькі гэтых слоў сакратарцы і не хапала.

– Я табе аддам! Бач, які сьмелы стаў. Ці блізкі сьвет ехаў, маці адпраўляла, і на табе "аддавайце дакументы"!.. – закрычала яна на Адама. – Сядзі тут, – загадала строга і выбегла за дзьверы.

Вярнулася праз нейкіх пару хвілінаў, схапіла Адама за руку і павяла па даўгім калідоры. Адчыніла дзьверы, упіхнула ў аўдыторыю, дзе было шмат сталоў, за якімі сядзелі такія ж, як ён, карантышы – хлопцы і дзяўчаты, і некалькі зусім дарослых, у вайсковай форме, відно, толькі што з арміі, і перад усімі – чыстая папера і ручка. Ля чорнай дошкі стаяла невысокая жанчынка з лістком паперы ў руцэ, як Адам здагадаўся, экзаменатарка, – тая, што будзе чытаць дыктант. Яна паказала Адаму на вольнае месца за адным са сталоў, і як толькі Адам усеўся, пачала дыктаваць.

Перш чым сесьці за стол, Адам яшчэ раз прабег позіркам па аўдыторыі: думаў убачыць Толю Мароза. Яны разам канчалі сем класаў, абодва атрымалі "Пахвальныя граматы". Гэта ён, вяртаючыся з цягніка дамоў, не пабаяўся зрабіць крук у дзесяць кіламетраў і падахвоціў Адама падаць дакументы ў педвучылішча, куды падаў і сам. Сярод тых, што зьбіраліся пісаць дыктант, Мароза не было. Відаць, ён трапіў у іншую групу.

Дыктант быў ня цяжкі, так падалося Адаму, але ў адным месцы ў ім быў сказ са словам, якога Адам ніколі ня чуў і значэньня якога ня ведаў. І экзаменатарка чытала яго скорагаворкай, быццам не пражаваўшы, і як ні ўслухоўваўся Адам і пры першым, і пры кантрольным чытаньні, разабраць слова ня мог. З адчуваньнем гэтай няяснасьці Адам і здаў свой лісток на праверку.

Экзаменатарка аб'явіла, што дыктант будуць правяраць зараз жа, і вынікі будуць гатовыя гадзіны праз тры, а пакуль што ўсе могуць быць вольныя. Тры гадзіны – гэта нядоўга, гэта было нават добра, бо ў Адама быў яшчэ адзін важны клопат. Грошай дома назьбіралі толькі на білет сюды, а на білет назад трэба было яшчэ зарабіць, а папрасту прадаць арэхі і

грушы, якія прывёз з сабой. Перад паездкай сюды яны з Вовам, браценікам-аднагодкам, хадзілі за Вольсу, на месца колішніх партызанскіх лагераў. Там на даўняй высечцы было шмат старога арэшніку, а год на арэхі выдаўся багаты. Адно была задача: па гладкім ствале дабрацца да зялёнага верху, зачапіцца рукой за сук ці вяршыню і прыгнуць арэшыну да зямлі. Арэхаў нарвалі па дзьве торбы, пакуль вярталіся дамоў – палузалі. Вова ссыпаў і свае ў Адамаву торбу:

– Паспрабуй не паступі – пойдзеш за раку адзін і вернеш усе да аднаго, – сказаў на разьвітаньне.

“Што ж, засталося няшмат чакаць, і стане вядома: паступіў твой брат ці не паступіў... Калі па дыктанце будзе чатыры ці пяць – паступіў, а калі тройка, як казаў вусаты пасажыр, справа дрэнь,” – разважаў Адам, хаця ўнутрана для сябе не дапускаў гэтага “а калі тройка...”.

Мовы – і беларуская, і руская ў школе ў яго ішлі добра, на пяцёркі. Але тое было ў школе, а тут зусім іншае... І гэтае незразумелае слова... Яно трывожыла Адама... А раптам і праўда тройка? Тады трэба здаваць усе экзамены. А як здаваць, калі ні грошай, ні харчоў, ні кватэры? Да тройкі ён ня быў гатовы.

Толькі выйшаўшы з будынку педвучылішча, Адам успомніў, што сёньня яшчэ нічога ня еў: у вакзале пасаромеўся людзей, а пасьля было не да таго. Перайшоў цераз вуліцу, сеў на травяным узвышэньні ля блакітнага ларка, у якім прадаваліся піва, печаная рыба, піражкі з мясам і павідлам і яшчэ шмат чаго, на што Адам мог толькі паглядзець, і палез у сваю торбу. Там, зьверху, загорнутыя мамай у кавалак белай палатніны, ляжалі акраец хлеба і ладны скрыль сала. Еў, ня чуючы ні голаду, ні смаку, знаходзячыся ўсё яшчэ там, на дыктанце. Перад ім, па другі бок брукаванкі, за густымі кучаравымі акацыямі шырока разьлёгся белы мураваны будынак педвучылішча. Яго педвучылішча... Яго!?

За сьпіной булькала вада – гэта праз заглуш дзікай травы і парасткаў лазы прабіваўся ручай. “Бач, усім перагарадзілі, і зямлёй, і лазой, і дарогай, а ён прабіваецца, цячэ”, – падумаў Адам. Устаў, закінуў на плячо торбу і пайшоў па вуліцы – так, куды прывядуць ногі. Прывялі яны куды і трэба было – на гарадскі кірмаш – вялізную агароджаную прастору з высокімі слупамі на ўезьдзе, з дашчанымі прылаўкамі і прылавачкамі, з крамамі і крамкамі.

Гэты дзень быў для Адама ўдачлівы. І пазьней – праз дзесяць і болей гадоў ён будзе лічыць яго самым шчасьлівым у сваім жыцьці.

У адной заціснутай з усіх бакоў крамцы ён купіў шклянку пад арэхі – ня самую вялікую і ня самую малую, так, на добрую жменю... Вярнуўся ў педвучылішча. Калідор перад аўдыторыяй, дзе пісалі дыктант, гуў галасамі, як патрывожаная пчаліная сям’я. Цяпер тут было шмат бацькоў. Адама кальнула шкадаваньне, што з ім нікога не было, не было каму ні парадавацца за яго, ні падтрымаць, калі, ня дай Божа, праваліўся... Не, праваліцца ён ня можа... Ня можа... Ня можа...

Неўзабаве зьявіўся высокі строгі чалавек у цёмным касьцюме са сьпісам у руцэ. Заглядваў у яго, называў прозьвішча, за прозьвішчам – адзнаку. Адам парадаваўся, што ягонае прозьвішча не ў пачатку алфавіту, не на А ці Б, а недзе ўсярэдзіне. А то не пасьпееш адумацца – і ўжо цябе прачыталі, і ідзі гуляй, ці плач, ці радуйся. А тут пакуль дойдзе чарга да цябе, ёсьць час, ёсьць нейкая надзея... Чацьвёрак было болей, чым троек, ча-

мусьці было шмат двоек... Адам неразумеў:ісьці на такія экзамены і – двойка... "Чатыры, чатыры, тры, два, два, чатыры, пяць, два, два, чатыры, чатыры..." Нарэшце... "Кудзін В. – два". Як... "два"? Ня можа быць!.. І чаму Кудзін В.? Ён жа Кудзін А., Кудзін Адам! Нарэшце, пасьля невялікай паўзы, – чалавек у цёмным касьцюме, відаць, зьбіўся, чытаючы сьпіс: "Кудзін А. – чатыры"... Во ён я – Кудзін Адам, а ня нейкі Кудзін В. – Чатыры!.. Чатыры! Чатыры!.. Ура табе, дзядзька з вусамі і мужык з курамі! Прадаваў і прадавай далей. Вова... Нічога я табе, дарагі брацік, вяртаць ня буду, нічога я табе не вінаваты. Хаця за раку мы з табой яшчэ сходзім: надта шмат там арэхаў.

Як у нейкім млявым тумане, ня чуючы самога сябе, выйшаў Адам на вуліцу. І падзівіўся, што на небе працягвае ярка сьвяціць сонца, езьдзяць машыны, ходзяць людзі, ідзе жыцьцё, быццам нідзе нічога не адбылося. Як гэта "нічога не адбылося"? Адам Кудзін паступіў у педвучылішча!

Прадаваць арэхі і грушы Адам вырашыў на вакзале: там і людзей шмат, і ехаць дамоў адтуль.

У вакзале было шмат вайскоўцаў: некуды дружна пераязджалі. Адам выйшаў на перон. Адразу за расчыненымі дзьвярамі, пад сьцяной, на невысокай скрынцы сядзеў дзядок – успухлая шчака падвязаная чорнай хусьцінай, і сам увесь як пакутнік. Перад ім на разасланай газеце акуратнымі пірамідкамі ляжалі прадаўгаватыя жоўценькія грушы, крутабокія чырвоныя яблыкі. Сьцяна вакзалу даўгая, месца шмат, і Адам прымасьціўся недалёка ад дзеда. Паздароўкаўся, але той глянуў абыякавым позіркам, пажаваў падвязанай сківіцай і прамаўчаў. Адам расхінуў сваю торбу, каб добра быў відзён тавар, насыпаў у шклянку арэхаў, выклаў на паперу некалькі груш. Побач з дзедавымі Адамавы грушы бракавалі – то былі звычайныя гнілкі, але – што маем, тое маем, ня везьці ж іх назад. Затое арэхі былі адзін у адзін – прадаўгаватыя, як жалуды, жоўта-белыя лузанцы: дзівіцеся, людзі, купляйце! Дзед кінуў касым вокам на Адамавы падрыхтаваньні, але зноў нічога не сказаў.

Першы пакупнік быў маладзенькі лейтэнант. Падышоў, кіўнуў на шклянку і спытаў:

– Колькі?..

"Колькі?.." Толькі цяпер Адам спахапіўся, што ня ведае, колькі прасіць. На ўсякі выпадак сказаў:

– Пяцьдзесят капеек, – і зазірнуў у вочы лейтэнанту: ці не задорага. На твары лейтэнанта нічога ня ўбачыў. Той паклаў капейкі ў Адамаву шапку, а сам падставіў кішэню кіцелю: сып. Адам усыпаў. Хвілінаў праз дзесяць лейтэнант вярнуўся не адзін – з прыгожай белавалосай дзяўчынай, сказаў: "Добрыя арэхі, – і падаў два рублі: – Давай". Дзяўчына расчыніла невялічкі радыкюльчык, і Адам адмераў туды чатыры шклянкі.

За лейтэнантам пакупнікі пайшлі адзін за адным. Куплялі арэхі, а заадно і грушы. Адам адчуваў нейкую няёмкасьць перад дзедам: няпрошана ўбіўся ў ягоны надзел і, па ўсім, адбіраў пакупнікоў. Але што рабіць? Кожнаму патрэбныя грошы, а Адаму тым болей: трэба ж дабірацца дахаты. Калі ўтварыўся невялікі збой у пакупніках, Адам пачаставаў арэхамі дзеда, не шкадуючы ўсыпаўшы добрую шклянку ў падстаўленую кішэню. Падумаў, што гандаль ідзе бойка таму, што ён *дзёшава* прадае, і падвысіў цану, рашыў браць па семдзесят пяць капеек за шклянку. Пакупнікі, здаецца, не заўважылі, што цана падскочыла, куплялі, як і раней.

Відаць, у кожным чалавеку сьпіць чарвячок гандляра: прадаць даражэй, купіць таньней. Чарвячок сьпіць, чакае свой час, сваю ўдачу. Варта адзін раз пацешыць гэтага чарвячка, як апетыт яго вырастае шматкроць. Так было і з Адамам. Арэхаў заставалася ўжо ня так і шмат, і Адам у чарговы раз падумаў, ці не прадае свой тавар таньней, чым гэта прынята ў гандлёвым сьвеце, і ўзьняў цану да рубля за шклянку. У душы ён адчуваў, што гэта не зусім чэсна – адным за пяцьдзесят капеек, другім – за рубель, – але жаданьне зарабіць трошкі болей перасіліла чэснасьць. Расплата прыйшла зараз жа. Маладзенькі лейтэнанцік, падобны да таго, што першы купляў арэхі, спытаў:

– А дзе той хлопчык, што прадаваў арэхі па пяцьдзесят капеек?

Адам уцягнуў галаву ў плечы, чакаючы кары, як грому. Грому не было, а лейтэнант паклаў два рублі ў шапку, сказаў: “Сып, колькі знаеш”. І адвярнуўся. Адам усыпаў яму тры поўныя шклянкі, але адчуваў сябе пагана.

І арэхі, і грушы нарэшце скончыліся, і Адам з палёгкай уздыхнуў, пакідаючы дзеда з ягонымі грушамі і яблыкамі. Ён пасаромеўся палічыць пры ім выручку, адчуваючы віну і перад ім, і перад лейтэнантам, з якога хацеў узяць па рублю за шклянку. Гэтая віна не пакідала яго і ў цягніку, які вёз дамоў. Але дома адчуваньне віны зьнікла, быццам яго і не было зусім. Мама Адамаў гандаль ацаніла як добры і выгадны:

– Адкуль ты ведаў, па колькі трэба прасіць? Раз людзі плацяць, значыць, цана правільная!

А Вова быў яшчэ сьмялейшы:

— Трэба было адразу па рублю браць, а то і па паўтара. Хай кожны сам паспрабуе схадзіць за раку, шэсьць кілометраў туды ды шэсьць назад, ды палазіць па карчах, ды ўзабрацца на кожную арэшыну, ды... Не-е, трэба было адразу браць па паўтара рубля.

Адам маўчаў. У ім іграла адна радасная музыка: паступіў, паступіў!

І толькі праз шмат гадоў, праглядаючы старыя фотаздымкі, ён наткнецца на маленькае фота, зробленае тым летам на дакументы. На фота – хлапчук з насьцярожанымі сумнымі вачамі. У белай кашулі з расшпіленым каўняром, прыгорбіўшыся, ён сядзіць на казённым, адведзеным для фатаграфаваньня стуле. Безабароннасьць і чаканьне ў вачах, і ва ўсёй ягонай маленькай постаці. Чаканьне няведама чаго. Хоць вазьмі і пашкадуй, пагладзь па галоўцы... Ці не таму так ахвоча, абмінаючы дзеда, куплялі ў яго і арэхі, і грушы?..

І вось праз столькі гадоў Адам ізноў на тым вакзале. Перад будынкам, проста на зялёнай траве дзьве бабкі параскладалі свой няхітры тавар: агародную зеляніну, грушы, яблыкі. Трошкі ўбаку ад іх, як строгі ахоўнік, паклаўшы галаву на лапы, ляжыць вялікі руды сабака з густой, мядзьведжай поўсьцю.

Адам зайшоў у вакзал. Прасторна, як у царкве, і... няўтульна. Паўз сьцяну і ля ўваходу нізенькія лаўкі з гнутай фанеры на металічных трубчатых ножках. На правай і левай сьценах графікі руху цягнікоў – бліжніх і дальніх, бліжніх болей, дальніх зусім мала. Акенцы для продажу білетаў глуха закрытыя... Адам яшчэ раз абабег вачамі залу і ў дальнім правым кутку, як нешта роднае, убачыў спачатку літары “МПС”, а пасьля і самі дзьве лаўкі, састаўленыя вуглом, – усё такія ж масіўныя і, здавалася, не-

падуладныя часу. “Бач, ня ўсе павыкідвалі”, – падумаў без асаблівага шкадаваньня. Тады ўвесь гэты бок па самае вакно займаў буфет. Шмат што з дарожнай яды прадавалася ў ім, нават піва і гарэлка, але Адаму запомніліся піражкі з павідлам і белыя булкі з чырвонай ікрой. І піражкі былі смачныя, а булкі... Гэта было нешта незвычайнае: вялізныя, круглыя, разрэзаныя болей чым напалавіну, каб у гэты разрэз можна было напхаць масла і чырвонай ікры, шмат масла і шмат ікры. Тады, пасьля продажу арэхаў, ён быў багаты. Купіў білет, а потым прыстроіўся і ў буфетную чаргу. Узяў чаю, два піражкі з павідлам і яе, булку з ікрой. Гэта была першая *такая* булка. Ды, здаецца, і апошняя. Пасьля ці то іх перасталі прадаваць, ці ў Адама не было на іх грошай.

Адам падышоў да дзьвярэй на перон. Здалося: варта таўхануць іх, выйсьці, – і пад сьцяной ён убачыць дзядка з падвязанай сківіцай. Таўхануў дзьверы, яны не паддаліся: былі замкнёныя. Бліжэйшы пасажырскі цягнік павінен быў ісьці толькі вечарам, то і дзьверы замкнулі.

Колькі разоў ён сыходзіў на гэтым вакзале, колькі разоў ад'язджаў адсюль?.. Ад'езды помніліся вастрэй. Можа, таму, што ехаў дамоў?.. Галоўнае было ўкінуцца ў вагон, залезьці на верхнюю паліцу, каб не церабілі пасажыры, што садзіліся на адзін-два прагоны. Абняць абгорнутую нечым мяккім трубу ацяпленьня і дачакацца, калі цягнік кранецца, набярэ разгон і вагон пачне вадзіць убакі пад пасьпешлівы перастук колаў. Якое гэта шчасьце: ты едзеш дамоў!..

У цягніка было сваё імя – “Калуга – Баранавічы”, яно хавала ў сабе тайну двух невядомых Адаму гарадоў, – якая яна, Калуга, якія яны – Баранавічы? То быў адзіны пасажырскі цягнік, які скразным ходам злучаў Слуцк і ягоную Нясяту. Ішоў ён пасьля поўначы, і пакуль той дом, можна было прыснуць, ловячы праз дрымоту аднолькава металічны для ўсіх станцыяў голас, які аб'яўляў час адходу цягніка і назву станцыі. Назвы тыя і цяпер засталіся ў Адамавай памяці, як табліца множаньня. Некрашы, Урэчча, Старыя Дарогі, Дараганава... З усіх назваў у душу чамусьці запала Дараганава... Як пачатак песьні, як пачатак нечага... Якога нечага?

Тры гадзіны ночы, вагон сьпіць. Цягнік прытарможвае ход, спыняецца. Праваднік адкідвае прыступку, каб выпусьціць некалькі пасажыраў. Усьлед за імі саскоквае на зямлю і Адам. Зіма. Усё засьнежанае, замёрлае, начное. Праз мроіва марознага туману ўгадваюцца белыя дамы, а далей туман і лес, лес і туман... Усё, як і ў яго дома...

– Чаго ты выходзіў? – спытаў праваднік. Яго зьдзівіў незапланаваны выхад.

– Хацеў паглядзець на Дараганава.

– Убачыў?

– Убачыў.

– То ідзі ў вагон.

Адам вяртаецца ў вагон, залазіць на сваё месца, прыціскаецца да цёплай трубы. Цягнік зноў набірае разгон, раскалыхвае ноч пад сонную музыку: Дараганава, Дараганава... Потым будуць Асіповічы, там цягнік стаіць доўга, потым будзе Тачанка, будуць яшчэ прыпынкі і нарэшце яна – Нясята...

Адам выйшаў з вакзалу, абышоў будынак збоку. Сьвяціла сонца, пахла перагарэлым шлакам. Як і тады, недзе за дамамі чахкаў паравозік. Перон быў бязьлюдны. За цагляным выступам ля замкнёных дзьвярэй

стаяла пустая дашчаная скрыня з-пад бутэлек. Па ўсім, гандаль на гэтым бойкім месцы не заглух зусім.

Адам прысеў на скрынку, адкінуўся галавой да сьцяны, заплюшчыў вочы. Паспрабаваў уявіць сябе тым маленькім хлапчуком, які прыехаў у незнаёмы далёкі горад, каб пачаць невядомае, самастойнае жыцьцё. І нібыта на нагах ягоных не дарагія імпартныя чаравікі, а ён босы, як тады. Вось ён ідзе па сьцежцы паўз чыгуначнае палатно, на сьцежцы шмат вугальнага шлаку – гэтакіх маленькіх чорных вожыкаў, яны балюча ўпіваюцца ў падэшвы ног, асабліва, калі наступіш пятой, і таму Адам стараецца трымацца ўзбоч сьцежкі, ступаць па траве...

Але ў душы не было нічога таго, колішняга, не было і таго хваляваньня, якое, як ён думаў, зьявіцца, варта яму толькі прыехаць сюды. Ён чакаў нечага, што скаланула б яго, вярнула ў той ягоны сьвет, а гэтага “нечага” не было. Была пустата і абыякавасьць староньняга чалавека, у якога быў лішні час, і ён зайшоў на кірмаш, хоць купляць нічога не зьбіраўся. Сядзеў, прытуліўшыся плячамі да шурпатай сьцяны, збоку можна было падумаць – дрэмле чалавек ці яму стала блага. І раптам пачуў нейкі рух, варушэньне. Расплюшчыў вочы. Перад ім стаяў мужчына гадоў дваццаці пяці ў сьветлым летнім касьцюме, кішэня штаноў акругла адтапыраная. Бялява-сінявaты твар і стомленыя вочы гаварылі пра пакуты ўчора перапітага, а сёньня не апахмеленага чалавека.

– Мусіць, перабраў учора? – са спачуваньнем сказаў да Адама мужчына, адхінаючы крысо пінжака і паказваючы пляшку віна. – То давай палечымся.

Адам пакруціў галавой: не. Мужчына зразумеў гэта па-свойму:

– Ня бойся, сюды міліцыя не заглядвае, а аднаму неяк няёмка.

– Я за рулём, – вяла адказаў Адам, ня маючы ахвоты ўлазіць ва ўсю праўду. Самому было цяжка, а яшчэ цяжэй было глядзець на гэтага чалавека з пакутным тварам.

– Ну, калі за рулём... А можа, хоць трошкі?

– Не. А ты выпі, табе гэта трэба.

– Тады будзьце здаровы.

– На здароўе, – адказаў Адам, стараючыся ня бачыць, як дрыжачай рукой, расплёхваючы, мужчына налівае ў пластыкавую шклянку чырванаваты напой, падносіць шклянку да роту.

Адам вярнуўся да воданапорнай вежы, пакінуўшы чалавека з недапітай пляшкай аднаго. Пераставіў машыну, каб не выходзіла з ценю, а сам пайшоў паўз пуці – той сьцежкай, якой некалі ішоў першы раз. Здавалася, тут нічога не перамянілася: тыя ж, ці такія ж дагледжаныя дамы, такія ж маленькія двары, праўда, з гаражамі, з машынамі. Дайшоў да пераезду і далей па сьцежцы да хаткі-мазанкі з крывабокай каравай ігрушай ля дзьвярэй і хлевушком, нібы прылепленым да глухой сьцяны. Тынкоўка на хатцы патрэскалася, а ля вушака і зусім адвалілася, паказваючы белыя лучыны. Адам падумаў, што сэрца цёткі Шуры – колішняй гаспадыні гэтай хаткі – ня вытрымала б бачыць такі непарадак. Яна замяшала б гліну з дробна пасечанай саломай і замазала б і гэтыя трэшчыны, і ўсё, што абвалілася, пасьля пабяліла б, і хатка была б, як лялька. І ўсё-такі была спадзеўка: “А можа, цётка Шура яшчэ жыве тут?..” Спадзеўка вельмі няпэўная, бо ня надта дагледжаныя градкі буракоў і агуркоў ля хаткі падказвалі, што тут яўна другая гаспадыня.

І хлевушок расчынены напята, у ім відна сухая даўняя пацяруха. Значыць, ні каровы, ні сьвіней у ім не трымаюць, а цётка Шура заўсёды трымала. Цяжка было нават падумаць, што недзе некалі яна зможа жыць бяз клопату пра гэтых жывых чатырохногіх істотаў, з якімі яна ўмела так любоўна гаварыць, быццам бы гэта былі яе дзеці. Можа, і гаварыла так таму, што дзяцей у цёткі Шуры і яе мужа дзядзькі Грышы не было.

Дзьверы ў нізкія сенечкі былі расчыненыя, і Адам пастукаў костачкамі пальцаў аб вушак, даючы знак пра сябе. На стук аднекуль з глыбіні азваўся звонкі жаночы голас:

– Хто там? Заходзьце!

Падлога ў сенечках была земляная, як і тады. Справа ад уваходу некалі стаяла лаўка, яна і цяпер была там. Тады на ёй месьціліся керагаз, карычневы эмаліраваны чайнік, у які дзядзька Грыша любіў набіраць піва, якое надта падабаў, гладышкі з малаком, вядро з вадой. Цяпер на лаўцы стаяла толькі вядро.

Адам ступіў цераз парог у хатку. Каля печы стаяла маладая жанчына і, склаўшы рукі пад грудзьмі, з цікаўнасьцю пазірала на яго. Чакала, што ён скажа.

– Тут некалі жылі... – пачаў Адам, акідваючы вачамі пакой. Два невялікія акенцы, печ – вось, відаць, і ўсё, што засталося нязьменным з таго часу. На сьцяне па левай руцэ некалі віселі партрэты цёткі Шуры і дзядзькі Грышы. Цётка Шура была на восем гадоў старэйшая за мужа, але на партрэце яна выглядала маладзейшай за яго – тут фатограф пастараўся як трэба. Цяпер на тым месцы таксама вісеў партрэт – але маладога незнаёмага Адаму чалавека.

– Дык чаго мы стаімо, сядаймо, – сказала жанчына і паказала брывамі на стул каля стала. Сама села на такі ж стул пры печы.

– Тут некалі жылі... – паўтарыў Адам, марудна падбіраючы патрэбныя словы, – гаспадары гэтай хароміны – цётка Шура і дзядзька Грыша...

– То гэта було даўно, – усьміхнулася жанчына.

Адам кіўнуў галавой: праўда, даўно. Яго некалі зьдзівіла і зачаравала гаворка цёткі Шуры, гэтыя яе “було”, “сабраўса”, “наеўса”, “рабіцьмем”, “сядзецьмем“... Сам з Магілёўшчыны, ён упершыню тут пачуў расьпеўную палескую гаворку, дзівіўся ёй і палюбіў. І цяпер яму падалося, быццам ён зноў пачуў голас цёткі Шуры.

– Ага, даўно, – паўтарыла жанчына. – Яны выехалі на Украіну, на мужаву радзіну, а гэтую, як вы кажаце, хароміну адкупілі мы з мужам, – ківок галавой на партрэт невядомага Адаму маладога чалавека. – Думалі, пабудам годдругі і пераедам у гарадскую кватэру, а ўсё не выходзіць, – дадала, нібы апраўдваючыся.

Ложак, на якім спалі гаспадары, тады стаяў у кутку, між вокнамі, тое месца цяпер займала тахта. Адам спаў справа, за печчу, там цяпер люстранасьветла блішчэлі дзьверцы шыфаньера. Адам плаціў за кватэру сорак рублёў – тое, што выдавалі ў педвучылішчы на кватплату. Цётка Шура варыла яму есьці, мыла бялізну, і ўзялі яны яго на жыцьцё не за грошы, а каб самім было весялей і ў хаце нехта заставаўся, калі яны былі на працы. Ён пражыў тут цэлы год – пакуль не знайшлося месца ў інтэрнаце. Пайшоў адсюль і панёс у душы ўдзячнасьць гаспадарам за цяпло і дабро, якім яны дзяліліся з ім. Панёс і перажываньне, бяду, якая здарылася з ім пад канец таго году і прысьпешыла ягоны пераход у інтэрнат. Бяда гэтая мела страшную назву – “вошы”.

Сам ён нават ня ведаў, што яны завяліся ў яго, першая іх убачыла цётка Шура, мыючы бялізну. Убачыла і паказала яму. Толькі праз шмат гадоў ён зразумее, адкуль і чаму яны пайшлі ў яго: ён вельмі сумаваў па доме, па хлопцах-равесьніках, братах і браценіках, ім там добра, яны ўсе разам, а ён адзін, а тут яшчэ першыя экзамены, і ён ледзь не заваліў матэматыку, прадмет, які любіў і ведаў лепей за іншыя. "Мужык прадаваў курэй..." Ніколі не баяўся матэматыкі... Гэтая сьмеласьць, пераацэнка сваіх сілаў, па ўсім, і сталіся прычынай бяды. І пайшлі вошы... Ён ня мог глядзець у вочы цётцы Шуры, яму было сорамна, нібыта ён сьпецыяльна разьвёў іх, і гэты сорам доўгія гады ішоў разам з ім, як нешта гідкае і нявартае чалавека.

– А вы не радня ім будзеце? – спытаў ён у новай гаспадыні хаткі.

– Не, не радня, – адказала жанчына, перастаўшы ўсьміхацца. – Мы адсюль недалёка, з-за Старобіна, адкуль і цётка Шура.

– Я тут некалі жыў... – сказаў Адам, устаючы.

– Я так і падумала, – адказала жанчына, выходзячы ўсьлед за ім на двор.

Адам вярнуўся на пераезд, прайшоў па вуліцы паўз усё тыя ж чырвоныя цагляныя дамы, зьвярнуў у вузкі, як праціснуцца машыне, завулак. У глыбіні завулку лёгка знайшоў дом, заценены ад дарогі зеленьню яблыняў. Некалі тут жыла яго аднакурсьніца Ніна. Яна падабалася Адаму, нават болей – ён кахаў яе, хоць адкрыта сказаць пра гэта не асьмеліўся. І ў гэты дом заходзіў некалькі разоў. Гэта быў дом дырэктара педвучылішча, а Ніна была ягоная пляменьніца. Ня страшна было напароцца на самога дырэктара – высокага, сьветлавалосага, строга апранутага мужчыну: ён у іхняй групе нічога не выкладаў і мала каго ведаў у твар. Страшней было сустрэцца з Бертай Сямёнаўнай, ягонай жонкай – мажной раздабрэлай жанчынай з вострымі сьлівова-чорнымі вачамі. Яна выкладала рускую мову і літаратуру. Нялёгка было вытрымаць яе халодна-спакойны позірк на ўроку, яшчэ цяжэй было сустрэцца з ёй дзе-небудзь адзін-на-адзін. У яе вачах заўсёды жыло пытаньне недаверу да ўсіх і да ўсяго. Жаданьне пабачыць Ніну, можа, ня толькі яе, але яе перш за ўсё, прывяло Адама ў гэты горад і гэты завулак. І дзе, як ня ў гэтым завулку, будуць ведаць, дзе яе шукаць. Пра тое, чаму гэты яго прыезд здарыўся не пятнаццаць, дзесяць ці нават пяць гадоў таму, сёньня Адам не хацеў думаць. Так склалася. Мусіць, так трэба было.

Па прытаптанай травяной дарожцы Адам падышоў да металічных, пафарбаваных у блакітны колер варотцаў. Ён помніў іх зялёнымі. Яны былі на простай зашчапцы.

На яго стук у дзьверы дома ніхто не абазваўся. Дзьверы былі незамкнёныя, і ён адчыніў іх сам, зайшоў. У калідорчыку, што палавініў дом, пад вешалкай валяліся ялавыя боты з даўно наліплай гразьзю, гумовікі, чаравікі, на вешалцы віселі куфайка, плашч-дажджавік, кажух дзедаўскага пашыву – усё мужчынскае і ўсё на вялікага чалавека. І ня ведай, а зразумееш, што ў доме жыве рыбак ці паляўнічы.

– Ці ёсьць хто жывы ў доме? – гучна спытаў Адам.

Дзьверы аднаго з бакавых пакояў адчыніліся, і ў праёме паказалася нешта шырокае, масіўнае, з белым ацесьлівым тварам. Паказалася, а пасьля і ступіла ў калідорчык. У гэтым шырокім, масіўным, белым Адам пазнаў Берту Сямёнаўну, і падзівіўся, наколькі ўсё, што было ў ёй некалі, а была яна буйнацелая, моцная, разраслося, распаўзлося, набыўшы не-

здаровыя аб’ёмныя формы. Адно чорныя вочы адлівалі тым жа цікаўным сьлівовым бляскам. Некалі іх баяліся ўсе студэнты...

Вочы прашчупвалі Адама: “Хто ты і што табе трэба?”. Відно было, што яго не пазналі, і гэта было добра.

“Хто я і што мне трэба?..” Адаму ня стала гарачэй, як гэта здаралася некалі, калі Берта Сямёнаўна выклікала яго да дошкі і задавала якоенебудзь нечаканае і часам не зусім лагічнае пытаньне. “Раскажы нам пра паэму Аляксандра Сяргеевіча Пушкіна “Мцыры”, – папрасіла аднойчы яна сваім строгім выкладчыцкім голасам, робячы націск на словах “Аляксандра Сяргеевіча Пушкіна”. Назваць Лермантава Пушкіным?.. То быў прымітыўны падвох. Адам маўчаў. За гэтым пытаньнем яму чулася другое, што маглі зразумець толькі трое – ён, Берта Сямёнаўна і Ніна. Яна сядзела ля дальняга вакна, і крутыя белыя шчокі яе наліваліся чырваньню тым болей, чым далей зацягвалася ягонае маўчаньне.

З нечага, можа, з жаночай інтуіцыі, Берта Сямёнаўна ўзяла, што Адам нераўнадушны да Ніны. Можа, і не ўзяла, можа, Адаму так здавалася, але самае страшнае – то была праўда, пра якую ведалі толькі ён і Ніна, а цяпер хацела ведаць і Берта Сямёнаўна. І пытаньне пра “пушкінскага” “Мцыры” было як праверачнае, зайздросьліва-помсьлівае. “Нічога вы ня ведаеце, Берта Сямёнаўна, бо я і сам нічога ня ведаю”, – харахорыўся ў думках Адам, насупліваючы бровы. І гэты ягоны адказ Берце Сямёнаўне чулі толькі яны ўтраіх, а можа, і не ўтраіх, а толькі ён сам, а ўся група чула такое: “Мцыры” – гэта паэма Міхаіла Юр’евіча Лермантава... У ёй расказваецца пра няшчаснага, але гордага і сьмелага чалавека... няшчаснага, бо паміраць яму давялося далёка ад радзімы... а гордага, бо ён гаварыў тое, што хацеў, і гаварыў тое, што думаў, і ўмеў пастаяць за сябе”...

– Гордага і сьмелага – гэта добра. І што “Мцыры” – паэма Лермантава, а ня Пушкіна, таксама добра, – мякчэў голас Берты Сямёнаўны. Адаму здавалася, што яна чула тое, што ён сказаў уголас, і тое, што казаў у думках. А яна працягвала: “Ну-ну, цікава... Расказвай далей...” Далей Адам пераказаў зьмест паэмы, яе ён ведаў на памяць і мог расказаць нават спрасоньня. Берта Сямёнаўна даслухала ягоны адказ да канца, і ў журнале насупраць Адамавага прозьвішча зьявілася “пяцёрка” – першая “пяцёрка” па яе прадмету. Як знак прызнаньня ягонай праўды?.. Якой праўды, Адам ня ведаў.

...Нейкі час Берта Сямёнаўна і Адам стаялі ў паўцёмным калідорчыку моўчкі, пазіраючы ў вочы адно аднаму. Адам падумаў сумна: “Якая ўсётакі прырода жорсткая! Спачатку дае чалавеку ўсяго з пераборам, а пасьля сама ж усё бязьлітасна і разбурае... Відаць, спадзяецца на розум: кожны павінен браць столькі, колькі трэба для здаровай меры. Лішняга і сьвіньні не ядуць... Выходзіць, людзі – не сьвіньні, грабуць усё, што могуць...

– Калі Вы да Сяргея Мікітавіча, то яго няма дома, — нарэшце сказала Берта Сямёнаўна. Ёй цяжка было трымаць на нагах разбухлае цела, яна няроўна дыхала.

– І да яго, і не да яго. Некалі, праўда, гэта было яшчэ пры педвучылішчы, тут жыла Ніна Сінягуб. То, можа, вы ведаеце, дзе яна зараз і як яе можна знайсьці? – прагаварыў Адам.

Нешта падобнае на непрыемнае зьдзіўленьне мільганула на твары Берты Сямёнаўны. Яна варухнула густымі чорнымі брывамі, акінула вачамі

Адама зьверху ўніз і назад і быццам сьпяшаючыся назвала нумар школы, у якой тая працавала.

Адам разьвітаўся, выйшаў. “Калі вы да Сяргея Мікітавіча...” І ў час вучобы ў педвучылішчы да Адама часам прыходзілі думкі пра тое, ці называе Берта Сямёнаўна свайго мужа іначай як “Сяргей Мікітавіч”... На працы – няхай сабе, гэта зразумела: і ён і яна – педагогі, працуюць разам, і перад студэнтамі ці перад выкладчыкамі, відаць, так трэба: “Сяргей Мікітавіч... Берта Сямёнаўна...” А дома? Адам шукаў тыя ласкавыя словы, з якімі Берта Сямёнаўна магла зьвяртацца да свайго мужа: “Сярожа... Сярожка... Сяргейка...” – і нічога, акрамя халоднага “Сяргея Мікітавіча” прыдумаць ня мог. Зноў жа, адкуль нехта нешта мог ведаць? Хаця і цяжка было ўявіць неабдымную Берту Сямёнаўну ў адной пасьцелі з па-юначы спартыўным Сяргеем Мікітавічам, але Берта Сямёнаўна нарадзіла хлопчыка. А дзеці, як вядома, без сумеснай пасьцелі не нараджаюцца... Адам тады быў на другім курсе...

...Вакзал, хатка цёткі Шуры, педвучылішча, інтэрнат на Вечаркевіча, Ніна... – такі быў менскі Адамаў расклад. Так усё і ішло. Сустрэча з Бертай Сямёнаўнай у гэтым раскладзе ня значылася, але яна не парушыла раскладу.

Усё па той жа вуліцы Адам дайшоў да педвучылішча. Тады будынак здаваўся вялізным і масіўным, а цяпер нібы паменшаў, нібы ўрос у зямлю. Высьлізганыя да залатога бляску медныя ручкі на ўваходных дзьвярах. Няўжо ён некалі браўся за іх? Няўжо нешта ягонае засталося на гэтых прыгожа выгнутых металічных дужках? Калідоры і на першым, і на другім паверсе ішлі па адным баку будынку, на ўсю яго даўжыню. Па правы бок – аднатонная сьцяна, у якую натуральна, як элементы дэкору, упісваліся дзьверы ў аўдыторыі і высокія прамавугольнікі абкладзеных белай кафляй грубак. Грубкі тапіліся дрывамі, і ў час зімовых халадоў добра было грэць рукі на іх гладкай люстрана-глянцавай паверхні. Цяпер цяпло будынку давалі вадзяныя батарэі. Па левы бок калідораў ішлі вокны ў моцных дубовых пераплётах, з тоўстымі шырокімі падваконьнікамі. Ні пераплётаў, ні тых падваконьнікаў. Старадаўнія вокны замененыя на сучасныя... Калі падняцца на другі паверх, на першым зьлева падваконьніку заўсёды ляжалі пісьмы, грашовыя пераводы. Адам браў у рукі толькі пісьмы, пераводаў яму ніхто ніколі не прысылаў. Не было каму і не было з чаго: на працадні ў калгасе грошай не давалі.

Адам падняўся на другі паверх. Калідор сустрэў прахалодай і цішынёй, быццам у будынку нікога жывога. Не, прабеглі дзьве дзяўчынкі ў белых халацiках. Невядома адкуль выскачылі і невядома куды прапалі. І зноў цішыня, як у падземным бункеры. Цяпер у будынку месьцілася медыцынскае вучылішча, лета, канікулы... І першы зьлева, і наступныя падваконьнікі чыстыя – ні табе лістка, ні канверта, усё белае і стэрыльнае. На другіх ад лесьвіцы дзьвярах некалі была шыльдачка: “Канцылярыя”. Цяпер нічога. Калі б не сакратарка, ня тая бабка з празрыста-сьветлымі вачамі, ці быў бы ён сёньня тут? Канешне, ня быў бы... Як яе звалі?.. Ня помніць... А можа, і ня ведаў... Відаць, ня ведаў... А калі адчыніць дзьверы і зайсьці... “Што Вам трэба?..” – “Што мне трэба? Хачу забраць дакументы...” – “Як гэта забраць дакументы?” – “А так... Не хачу...” – “Ня хочаце быць настаўнікам?” – “Нікім не хачу быць ...” – “Нікім? Нельга, чалавеча... Дык што ж

мне з Вамі рабіць?” – “Нічога ня трэба рабіць. Вярніце дакументы...” – “Ніхто іх Вам ня верне. Тое немагчыма...” – “Чаму немагчыма?”

Адам ішоў па калідоры і чуў, як у ім самім глухім рэхам аддаюцца і ягоныя крокі, і ягоныя пытаньні, і адказы. Позна... Позна...

Дайшоў да канца калідору, спыніўся ля кутняга вакна. Раптам убачыў сябе збоку, чужым вокам. Ціхі будынак, бязьлюдны калідор, чалавек стаіць ля вакна і невідушчым зрокам пазірае на дзьверы: нешта думае, можа, нешта зьбіраецца рабіць... “Што ты зьбіраешся рабіць?..” – “Зайшоў проста так”. – “Проста так ня ходзяць. Значыць, нешта трэба...” – “Нічога ня трэба. Хацеў паглядзець. Нешта ўбачыў, нешта ўспомніў, нечым дыхнуў”. – “Ну і ідзі, чалавеча, з Богам. Тут ужо нічога твайго няма. Падарожнік прыблудзіў на месца, дзе некалі быў, але забыўся, якая дарога прывяла туды і якая вядзе адтуль”. – “Дарога куды?..” – “Куды?.. Ніхто табе ня скажа...”

Адаму было цяжка адарваць сваё цела ад падваконьніка, на які абапіраўся, бо гэта значыла пакінуць гэты дом назаўсёды. Нешта трымала яго тут, як могілкі, дзе пахаваныя родныя. Нарэшце адштурхнуўся ад халоднай дошкі, зрабіў першы крок. Выйшаў праз тыя ж высокія дзьверы, яшчэ раз патрымаўшыся за медную ручку, нібы хацеў панесьці з сабой і яе металічны халадок, і даведзены да залацістага бляску цёмна-чырвоны колер. Абагнуў крыло будынка, зайшоў у двор – прамавугольны пляц, заціснуты з трох бакоў цаглянымі сьценамі. І не пазнаў яго. Бярозы, таполі, дубок... У іхнюю бытнасьць тут дрэваў не было. Тут, на чыстай прасторы, праходзілі заняткі па фізкультуры і ваеннай падрыхтоўцы. Цяпер пляц болей нагадваў парк, дрэвы ўскінуліся ўгору, перарасталі будынак. Адаму стала ніякавата, у гэтым новым убачылася няправільнасьць, а можа, і непатрэбнасьць.. Збоку будынку тады быў невялікі земляны ўчастак з агародам і градамі, абнесены невысокім парканам. Усё гэта даглядалі вартаўнік з жонкай, то была іхняя падсобная гаспадарка. Там стаяла некалькі лавачак, расло некалькі высокіх ігрушаў, знакамітых слуцкіх бэраў. Галіны іх кожнай восеньню ацяжарваліся вялікімі, падобнымі на гладышы, зелянкава-жоўтымі пладамі, цьвярдымі, але сакаўнымі і салодкімі. Як тут было не рызыкнуць на браканьерства – ці дастаць адзін-другі гладышык шастом, ці зьбіць палкай... Цяпер ні градаў, ні грушаў, ні лавачак...

Дарога з педвучылішча ў інтэрнат вяла праз Чортаў мосьцік – нешта прымітыўна дашчанае на высокіх кругла абчэсаных сваях, зьлепленае на скорую руку, здаецца, рвані добры вецер – і ўсё паляціць – і сваі, і дошкі, і падгнілыя парэнчы. Сапраўды, *Чортаў* мосьцік... Асабліва несамавіта глядзеўся ён у час паводак, калі Случ выходзіла з берагоў, займаючы вадой луг і бліжэйшыя агароды, і з аднаго берага ракі на другі можна было перабрацца толькі па кладках ды па гэтым хісткім мосьціку. Нешта падобнае меркаваў сустрэць Адам і зараз, а ўбачыў збудаваньне хоць і вузейшае, але скрозь металічнае – ад высокіх тонкіх сваяў да гулкага насьцілу, бакавінаў і парэнчаў... Ля берагу ракі ўсё тыя ж пакручаныя даўгім векам абымшэлыя вербы, праўда цяпер іх было нашмат меней. Справа на ўзвышэньні тады будаваўся дом са смаловага сьвежа-залацістага дрэва. Штабялі бярвеньняў, кучы трэсак... Стаяў ён і зараз на тым сваім месцы, пафарбаваны, прыхарошаны, у роўным страі падобных дамоў, зьвязаных зашытай дашчанай паласой у суцэльную вуліцу, ад якой адпачкоўваліся завулкі. Адам зьвярнуў у першы. Глядзеў па баках: нешта ўспаміналася,

нешта прыпаміналася, нешта падказвала памяць. Усё як праз сон, як праз туман... Завулак павінен быў вывесьці ў сквер, зьлева ад якога стаяла школа... Ёсьць і школа, і сквер. У канцы сквера стаяў помнік партызанам – нешта стандартна шэрабетоннае, высокакантовае. Стаіць і цяпер, і кветкі ў падножжы... Далей недзе справа дыміў завод, на ім вылівалі чыгуны і чыгункі – тыя, у якіх варылі і сабе, і скаціне. Відаць, вылівалі ня толькі чыгункі, а і яшчэ нешта, але пузатыя заводскія чыгункі можна было купіць у кожнай краме... І сёньня над высокай чорнай трубой завода сіціўся кволы дымок. Значыць, жыве курылка!.. Далей вуліца павінна павярнуць улева і прывесьці да інтэрнату, а па-іншаму, бараку – прыціснутай да зямлі даўгой будыніны пад бляшаным дахам, зьбітай з гладка чэсаных, шчыльна падагнаных шырокіх бёрнаў. Будавалі яго палонныя немцы і быў ён тады на далёкай ускраіне гораду. Чатырнаццаць пакояў, раскінутых па баках вузкага скразнога калідору, які пачынаўся агульнай кухняй з вадагрэўным "цітанам" і вялізнай чыгуннай плітой з кружкамі-адтулінамі для чыгункоў і скавародак. Дашчаная прыбіральня была вынесена далей ад бараку на ўскрай луга, за якім нязмушана спакойна цякла ўсё тая ж Случ...

Барак, як і тады, стаяў на сваім месцы, толькі цяпер гэта было зусім ня тое – нешта шэрае, недагледжанае, раскірэчанае, вокны пазабіваныя дошкамі, на ўваходна-тарцовых дзьвярах – вялікі акругла-металічны замок. Адам падняўся на бетонную прыступку, пакратаў замок – без усякай разумнай задачы, так, з вечнай чалавечай цікаўнасьці. Замок вісеў надзейна, хаця відно было, што даўно не адмыкаўся і, па ўсім, дажываў свой век разам з баракам.

У гэтым доме Адам пражыў два гады і шмат што мог успомніць з той пары. Праўда, цяпер усё тое было ў далёкай, і нібыта няіснай рэальнасьці, якая мела значэньне хіба што як элемент дзяжурнай вешкі на дарозе да ягонага сёньняшняга дня.

За двума першымі вокнамі хаваўся самы прасторны пакой, у якім жыло восем чалавек, і адным з іх быў Лёлік Плышэўскі, хлопец вечна задзірлівы і вечна галодны. Можа, і задзірлівасьць яго ішла ад таго ж голаду. Хаця, хто тады не галадаў... Вучыўся ён на курс вышэй за Адама і праславіўся сваімі выхадкамі. Аднойчы пайшоў на заклад: "што зьем – тое маё". Зьесьці трэба было, здавалася зусім няшмат – паўлітра ільнянога алею, але зьесьці за раз. Пляшка алею, скібка хлеба і... суддзі – куча разявак, усё тыя ж напаўгалодныя студэнты... Заклад Лёлік выйграў, але пасьля выйгрышу яго трое сутак так насіла, так выварочвала, ён спачатку пасінеў, потым пабялеў, потым стаў бязвольна жоўты, як васковая сьвечка... Але выжыў...

За Лёлікам значыўся яшчэ і такі подзьвіг, зноў жа завязаны на ежы і шклянцы старадарожскага самагону. Старадарожскі самагон – гэта шэсьцьдзесят ці болей градусаў, двайная перагонка, а ежа – заўсёды ежа. Лёлік сказаў, што за дзьвесьце грамаў гарэлкі і сала можа голы, у маміным родавым касьцюме, сярод белага дня аббегчы ўкруга бараку. Метраў пяцьдзесят у адзін бок, метраў пяцьдзесят у другі. Усюды вокны, усюды вочы і ў большасьці дзявочыя. І аббег. Была позьняя восень, халаднеча з дажджом і ветрам. Укруга барака Лёлік бег, а як ступіў на ганак, пад страху, чырвона-сіні, пайшоў павольна, уразвалку, быццам калідор быў ягонай сцэнай, і ён – галоўны акцёр на гэтай сцэне. Папраўдзе дык так і было, ён тут і быў галоўны. І хлопцы, што закладаліся з ім, далі

яму не шклянку “на здароўе”, а ўсё паўлітра той старадарожскай, каб жыў і выжыў...

Тут, у гэтых сьценах, і Адама першы раз скалануў эпілептычны прыпадак. Хвароба, пра якую да таго ён ня чуў і ня ведаў. Прыступ сутаргаў, пасьля якіх застаецца дзікі галаўны боль, слабасьць і нічога ў памяці пра тое, што з табой адбылося... На другі ці на трэці дзень пасьля прыпадку ля Адамавага ложка раптам зьявіліся два крэслы: на адным – Валодзя Кунцэвіч, ён ішоў на курс пазьней за Адама і жыў у суседнім пакоі, на другім – разасланая газета, на ёй белы хлеб, камса і закаркаваная “чацьвяртушка”. Не было сілы спытаць, адкуль гэта ўсё Валодзя, дзетдомаўскі сірата, узяў, як і не было ахвоты падначальвацца катэгарычнаму наказу доктара: “...і ніякага алкаголю...” Ці той самы забаронены “алкаголь”, ці само жыцьцё зрабілі сваё – Адам акрыяў.

...Адам спусьціўся з бетоннай прыступкі, адышоў ад барака, агледзеўся. Дамы з гародчыкамі і градамі з усіх бакоў заціснулі барак, адбіраючы ў яго і земляныя квадраты, і прастору. Тады дамоў было меней. Ля аднаго з іх расла крывая, надламаная ў камлі елка. Надламанае па жывым часе зраслося, зацягнула жывіцай, а ствол выпраміўся і пацягнуўся ўгору. Гэтая елка добра была відна з іхняга пакою. Адам пашукаў яе вачамі і знайшоў, і ўзрадаваўся: крывая, слабая, а выжыла.

На раку, дзе яны любілі купацца, – да яе тут было з паўкіламетра, – Адам не пайшоў. Адно акінуў позіркам жоўта-зялёную люцікавую разлогу, што распасьціралася перад ім і нібы запрашала: “Чаго стаіш? Бяры, як некалі, падручнік, кідайся ў траву і чытай – наперадзе экзамены...”

Хопіць экзаменаў. Экзаменаў ня будзе... Ні сёньня, ні заўтра...

Сонца, між тым, паказвала за поўдзень, трэба было вяртацца па машыну.

Сустрэчу з Нінай, як самае важнае, ён пакінуў на канец. Ён нават ня думаў пра тое, што Ніны можа ня быць у школе, ня быць дома, ня быць у горадзе.

Тым жа шляхам – паўз завод, цераз Партызанскі сквер – Адам вяртаўся назад. У прасьвеце між дамамі ўбачыў Дом культуры, павярнуў да яго. Стаяў ён на гары ў акружэньні высокіх ліпаў, таполяў, грушаў, і добра быў відзён з розных канцоў гораду. Цяпер у будынку ішоў рамонт: рыштаваньні, аблезлая, абсунутая тынкоўка, пазабіваныя вокны, цагляны друз пад сьценамі. І гэты дом застаўся ў памяці сваёй вешкай...

Быў нейкі сьвяточны вечар з канцэртам і танцамі. Ніна была ў прыталенай цёмна-вішнёвай сукенцы з карункавым накладным каўнерыкам. Белая цяжкая каса, высока ўскінутыя бровы. Яна была такая прыгожая! Як яму хацелася быць побач з ёй і як страшна было стаць побач. На нагах у яго былі старыя, крыва стаптаныя чаравікі, на плячах – картовы пінжачок.

З такімі ж, як і сам, хлопцамі з інтэрнату, у каго не было нічога сьвяточнага надзець і абуць, Адам стаяў ля сьцяны, заслонены ад цэнтру залы сьпінамі багацей апранутых студэнтаў і выкладчыкаў. Ніна бачыла яго, ён бачыў яе. Іграла музыка – вальс, полька, кракавяк... Некалькі разоў яе запрашаў на танец малады выкладчык гісторыі. Высокі, сухапары, з аскетычна інтэлігентным тварам і універсітэцкім ромбікам на лацкане пінжака, актыўна таварыскі – не выкладчык, а раўня кожнаму студэнту, ён нядаўна зьявіўся ў педвучылішчы і адразу заваяваў сімпатыю дзяўчат. І гэтак жа хутка страціў яе. Але тое будзе пазьней, а цяпер як сьмела ля-

жала ягоная рука ў Ніны на таліі і як ім абаім было весела. І як цяжка было Адаму бачыць гэта. Ён і ня стаў доўга глядзець на іх, вярнуўся ў інтэрнат. Гэта было не яго сьвята. А гісторык... Ён сьпіваўся на вачах у заваражаных ім жа дзяўчат так хутка, быццам не хацеў нікому даць час перашкодзіць гэтаму. Зарплаты не хапала, і ён пачаў пазычаць грошы: спачатку ў выкладчыкаў, потым у студэнтаў, зноў жа – спачатку ў хлопцаў, а пасьля і ў дзяўчат – у каго дзясятку, у каго пяцёрку. Ён зьнік з педвучылішча гэтак жа нечакана, як і зьявіўся, а з ім зьніклі і пазычаныя дзясяткі і пяцёркі.

Ля Дому культуры Адам не затрымаўся. І гэтае будаўнічае сьмецьце, пазабіваныя вокны, раскіданая тынкоўка – усё нечым нагадвала закінуты людзьмі колішні Адамаў інтэрнат, нібыта і там, і тут ніколі не было ніякага нармальнага жыцьця, а быў адзін рэзрух і непатрэбшчына.

Ніну ён знайшоў у школе. Канікулы – воля для школьнікаў, а не для настаўнікаў. Так было і тут.

Зайшлі ў недалёкае кафэ. Голыя, пакрытыя пластыкам сталы, пустая перадвячэрняя зала. Ён заказаў ёй віна, сабе таматнага соку: як-ніяк – мужык за рулём.

– Хоць я – чалавек непітушчы, а сёньня вып’ю, – сказала яна і жартам, і ўсур’ёз. – Праз столькі гадоў раптам аб’явілася людзіна, якую і ў сьне ўжо ня марыла ўбачыць.

Адпіла віна з фужэру, узяла са сподачка цукерку, пачала разгортваць. Сядзелі насупраць – двое на ўсю ціхую залу, ля акна, за якім была вуліца са сваім заўсёдным жыцьцём.

“Навошта я прыцягнуў яе сюды? – гэтая думка не-не ды і мільгала ў ягонай галаве. – Навошта?”

Спакойны белы твар. Як і некалі. Мажа, трошкі пагрубелы. Твар у яе заўсёды быў белы і ружавеў толькі тады, калі яна злавалася. Як прыгожа яна злавалася! Мяккасьць, упэўненасьць у рухах, у позірку. Настаўніца... Ён так ня ўмеў і ня ўмее. І вочы тыя ж – жывыя, цікаўныя, з намёкам нешта спытаць. Але не пытаецца. Спытаў ён:

– Як ты жывеш?

Словы дзяжурныя, але шчырыя. Гэта чулася па ціхім голасе.

– Добра. – Памаўчала. – У мяне харошы муж, сын. Сын канчае дзясяты клас, хоча паступаць у інстытут на замежныя мовы. Сам выбраў, сам рыхтуецца.. І наогул, мужчыны ў мяне малайцы. – Ні каліва какецтва ў словах, інтанацыі, усё проста, натуральна. – А ты як?

– Можна сказаць, таксама нармальна.

– Можна сказаць ці... сапраўды нармальна?

– Не чапляйся за словы.

– Ня буду. А як трапіў да нас?

– Захацелася прайсьціся па старых сьлядах. Наведаў сваю былую кватэру, зайшоў у педвучылішча. Дабраўся да інтэрнату на Вечаркевіча, паглядзеў на Дом культуры... – Пра сустрэчу з Бертай Сямёнаўнай не сказаў, нешта стрымала.

– Скажу, нямала. І што ўбачыў?

– Убачыў? Убачыў... – сумна зазначыў Адам. – Ніколі ня трэба вяртацца ў сады сваёй маладосьці. Хай растуць так, як расьлі некалі. Час ня робіць іх прыгажэйшымі. Ён можа толькі выкарчаваць іх ці забіць пустазельлем. Ведаеш, якой бы маленькай ні была радасьць некалі, з гадамі яна вырастае да памераў вялікай радасьці. І будзе такой, пакуль на яе

сьцежках не пачнуць таптацца пераацэншчыкі. Няважна, хто гэта – ці ты сам, ці нехта збоку.

– Навошта ж у душу пускаць пераацэншчыкаў? Гэта чужыя людзі, а душа – ня месца для чужых.

Адам быццам не пачуў Ніціных словаў, працягваў:

– З гадамі ўсё старэе. Нават душа. Сумна расставацца са старым паліто, якое доўга насіў, а цяпер трэба выкінуць, бо ўжо ня моднае.

– Ты прыехаў, каб выкінуць старое... паліто ці пашукаць моднае?

– І ня "выкінуць" старое і не "пашукаць" моднае, а... – Адам запнуўся. Глядзеў на Ніну і быццам ня бачыў яе.

– А?..

– А... – нейкая іскра праскочыла ў Адамавых вачах... – Праязджаў паўз дом Паўла Пракопавіча... Помніш? Канешне, помніш нашага Паўла Пракопавіча... "Петрусевіч, устаньце! Як ваша прозьвішча?.." "Высоцкая, калі вы будзеце так вучыць фізіку, я з вас цэлы год ня зьлезу..." Праязджаў паўз яго дом. Падбівала зазірнуць...

– Ты ведаеш, дзе ён жыве?.. Ён жа даўно на пенсіі...

– Неяк мы з Эдзікам Смольскім заязджалі да яго, нават начавалі...

Хто такі Эдзік Смольскі Ніне тлумачыць ня трэба было. То быў іхні аднакурсьнік, а ўсе аднакурсьнікі засталіся назаўсёды Эдзікамі, Толямі, Валямі, Лёдзямі, Любкамі, Марыйкамі...

З Эдзікам Адам здружыўся з самага пачатку вучобы. Селі за адзін стол пры першых занятках і не заўважылі, як праляцелі чатыры гады. Завадны па натуры і адкрыты душой, Эдзік лёгка сыходзіўся з людзьмі. Якраз гэтага бракавала непасьпешліваму і зацiснутаму ў сабе Адаму. Зблiжала іх ня толькі вучоба, ня толькі ўзрост.

Аднойчы пад вялікім сакрэтам Эдзік расказаў Адаму, як здарылася, што ён застаўся бяз бацькі.. А пад сакрэтам, бо было ў тым шмат незразумелага і таямнічага. Палесьсе, глухая лясная вёска... У райцэнтры і буйнейшых вёсках – паліцэйскія гарнізоны, у лясах і балотах – партызаны. Днём кіруюць адны, ноччу – другія. Зброя – і сіла, і права. Аднойчы летняй ноччу ў акно іхняй хаты забарабанілі: адчыняй! Бацька запаліў лучыну, адчыніў. Зайшлі незнаёмыя ўзброеныя людзі, нібыта партызаны. "Зброя ёсьць?" – "Якая зброя? Жонка, дзеці – вось і ўся зброя..."Ператрэсьлі ўсю хату, нічога не знайшлі. На бацьку: "Пайшлі, пакажаш дарогу". Назвалі дальнюю вёску, у яшчэ большых балотах. Хацеў абуць боты – не далі: гэта не надоўга. Хоць і лета, але што не далі абуцца, было дрэнным знакам. І як пайшоў, так і пайшоў. Невядома, і што гэта за людзі былі, і што ім трэба было ад бацькі... І на першым часе, калі бацька не вярнуўся, і пазьней, маці і сама, і праз людзей, і ў партызанаў, і ў паліцэйскіх спрабавала знайсьці хоць якія сьляды. Усё дарэмна: ніхто нічога ня чуў, ніхто нічога ня бачыў. Жыў чалавек – і ня стала чалавека, быў бацька – і ня стала бацькі. Але пасьля бацькоў застаюцца дзеці, а ім трэба жыць, вучыцца, працаваць. Адам разумеў Эдзіка: сам рос бяз бацькі...

Эдзік стаў Эдуардам Паўлавічам, бацькоўская прыстаўка зьявілася і ў Адама. Эдзік пайшоў у інфарматыку, Адам застаўся пры школе, засталася і дружба, народжаная педвучылішчам, і яны даражылі ёй. Так выбраліся і ў паездку на Палесьсе, так трапілі і да Паўла Пракопавіча.

– Ты быў у Слуцку і не захацеў знайсьці мяне?

– Мы былі праездам, – неахвотна адказаў Адам.

– Не падумай нічога... я бяз крыўды, але... быць у горадзе і... – Нінін твар пасуровеў, быццам яго сьцягнула знутры нейкая сіла.

– Тады я ня мог... –Адам ня стаў тлумачыць, чаму ня мог. Ніна ня стала дапытвацца.

Ня мог, а правільней – не хацеў, каб пры сустрэчы прысутнічаў нехта трэці. Ды і да Паўла Пракопавіча яны трапілі, можна сказаць, выпадкова. З Менску ехалі на Эдзікавым "масквічы", выбраліся позна, пагода абыякая – туман, імжа, раскіслы сьнег... Перад Слуцкам "масквічок" закапрызіў, трэба было шукаць нейкі прытулак і разьбірацца з машынай, наперадзе ляжала няблізкая дарога на Палесьсе – Салігорск, Старобін і далей... Тут якраз Эдзік і ўспомніў пра Паўла Пракопавіча. Так яны і заявіліся ў яго дом. Сустрэла іх жонка Паўла Пракопавіча, а пасьля зайшоў і ён сам – у куфайцы, кірзавых ботах, нешта рабіў на двары. Калі тое было педвучылішча, Адам думаў, што ўбачыць старога дзеда, а тут – маладыя вочы, чыста паголены твар з вялікаватым, застылым на холадзе носам, і сам задзірысты, як хлапчук. Эдзік з Паўлам Пракопавічам сустракаліся і пасьля педвучылішча, і цяпер Павел Пракопавіч павітаўся з ім так, быццам яны бачыліся не пазьней як учора. Адама ён таксама пазнаў адразу. "Я помню, як мы езьдзілі на іпадром за дзявятай школай, і вы зваліліся з матацыкла. Але адразу ўсхапіліся і хацелі ехаць далей...", – загаварыў так, быццам тое, пра што ён гаварыў, зноў жа, адбывалася зусім нядаўна... Жаданьне сказаць чалавеку добрае было заўсёды ў ягонай натуры, хаця сітуацыя, пра якую ён прыгадаў, выглядала даволі трагікамічнай. Было тое на другім курсе. Павел Пракопавіч арганізаваў гурток матыцыклістаў, сам вёў заняткі, ужо рыхтаваліся здаваць "на правы" і паехалі на чарговую трэніроўку. Задача ставілася такая: завесьці матацыкл, то быў новенькі "ІЖ", праехаць некалькі кругоў па перыметры іпадрому, спыніцца, заглушыць матор. Заняткі ішлі нармальна, некалькі чалавек прайшлі свой практыкум, надышла Адамава чарга. Якраз перад тым, як Адаму сесьці на матацыкл, Павел Пракопавіч адчуў нейкі непарадак у жываце. Ніякіх туалетаў паблізу не было, а ў цэнтры іпадрому заставалася ўсё яшчэ не прыгледжаная варонка ад бомбы ваенных часоў, зарослая бадыльлём і парасткамі лазы, і Павел Пракопавіч накіраваўся туды. Месца было выйгрышнае: высунуўшы галаву з бадыльля, можна бачыць усё кругом: як хто ад'язджае, як едзе, як спыняецца.. "ІЖ" завёўся з першага рыўка, Адам даў газу і з незнаёмай радасьцю назіраў, як стрэлка сьпідометра бяжыць наперад: 50. 60, 70... Адчуваньне хуткасьці як адчуваньне перамогі: то не было нічога, і вось ужо ты на крылах славы – вецер у вушах, дарога ляціць пад ногі – давай, давай!.. Стрэлка сьпідометра падбіралася пад 90, Адам ведаў: трэба скінуць газ, і тут нечакана вынырнула паваротка. Як ехаў, Адам машынальна крутануў руль. У галаве мільганула думка: "Калі тут праскочу – далей усё будзе добра..." Далей нічога добрага не было. Удар сядла пад зад падкінуў Адама ўгору і шпурнуў метраў на дзесяць наперад... Першае, што ён убачыў, усхапіўшыся на ногі, быў усё той жа матацыкл. Як павалены конь, ён ляжаў на баку, колы працягвалі круціцца, а праз дзірачку з бензабака туга пырскаў струменьчык бензіну. Адам падбег, выключыў матор, паставіў матацыкл на колы, зьбіраючыся ехаць далей, але да яго ўжо беглі з аднаго боку хлопцы, а з другога са сваёй засады, падцягваючы на хаду штаны, Павел Пракопавіч. "А я там сяджу, гляджу

і думаю: куды гэта ён так нясецца? І наце вам, перакуліўся...” – хутчэй зьдзіўлена, чым злосна, загаварыў ён, падбегшы.

У матацыкла была разьбітая фара, Адам перажыў псіхалагічны ператрус, вынікам якога стала тое, што пасьля ў яго ніколі не ўзьнікала жаданьня зноў сесьці на якога-небудзь двухколага зьвера.

Павел Пракопавіч шчыра радаваўся іхняму візіту:

– Малайцы, што заехалі. Пераначуеце, заўтра паглядзім машыну, і далей.. Дом вялікі, будаваў на ўсіх, а жывём удваіх. Дзеці разьляцеліся, – ужо за накрытым сталом з сумам гаварыў стары фізік.

Дом сапраўды быў вялікі, на пяць пакояў, вадзяное ацяпленьне, газ... Павел Пракопавіч будаваў яго ў іхнія педвучылішчныя гады сам, адзін. Бывала, што прасіў хлопцаў памагчы ўскінуць на зруб бервяно-другое, і яны заходзілі на выдзелены яму зямельны надзел і “раз-два ўзялі!” – ускідвалі тое бервяно. Ні ў кога і ў думках не было, што, можа, некалі некаму гэты дом дасьць прытулак. І вось даў... Абжыты двор, дагледжаны агарод, сад...

Пра што яны тады гаварылі? Пра ўсё гаварылі. Хаця гаварыў болей Павел Пракопавіч, а яны слухалі, яны зноў былі ягонымі студэнтамі. Успомніў пра дырэктара школы, які нядаўна памёр, а ў дзень іхняга прыезду якраз былі сарачыны.

– Хацеў камандаваць ня толькі ў школе, а і ў горадзе, – Павел Пракопавіч пра нябожчыка гаварыў так, нібыта той працягваў жыць. – Прыбудаваў да школы адно крыло, потым другое, усё расшыраўся... А тут здаюць новую школу. Да чаго дадумаўся: склаў акт, быццам бы ягоная школа ў аварыйным стане, гэта каб са сваімі вучнямі перайсьці ў новую. Не ўдалося – райкам упёрся... І вось... – Павел Пракопавіч развёў рукамі: ён не прымаў такога парадку жыцьця. Таму і на пахаваньне не пайшоў, і на сарачыны...

Нечакана Павел Пракопавіч выйшаў на літаратуру. Адам падзівіўся: фізік з галавы да ног, ключы-гайкі, прыборы ўсякія – і раптам Шамякін. Той толькі што надрукаваў у “Полымі” новую аповесьць.

– Харошы пісацель, толькі шмат парційнасьці. Шмат парційнасьці і мала художасьцьвеннасьці. Раман піша, як газету, але аблажылі почасьцямі, як хворага грэлкамі...

– Ты чытаў старыя раманы, ня ведаеш новае... – не згаджалася з ім жонка, ёй Шамякін падабаўся.

– Чытаў і новае. Мала художасьцьвеннасьці... Як і цяпер кругом. Не падабаецца мне, што ў “перабудове” мала канкрэтнага... Гаворым “перабудова”, а што рабіць, ня ведаем. Мне здаецца, што савецкім людзям ня трэба столькі засядаць. Засядаем, засядаем замест таго, каб рабіць работу. Летась, прызнаюся вам, хлопцы, сам нутрый дзяржаў, аж дзевяноста штук. Куды мне іх столькі? Вядома, на базар павёз. Пачала ганяць міліцыя: адкуль мяса, адкуль шкуркі? Плюнуў, махнуў рукой – навошта гэты клопат?

Успомніў, як вучыўся ў Мазырскім педінстытуце. То былі трыццатыя гады, “ворагі народу”...

– Раптам пачалі забіраць выкладчыкаў... Пачалі з польскага факультэту. Быў такі Сташэўскі, рэвалюцыянер, міністр юстыцыі ў беларускім урадзе, а пасьля яго прыслалі ў наш інстытут. Прыехалі, забралі яго, жонку. Дзьве дзевачкі засталіся. Потым пачалі хапаць другіх выкладчыкаў, пасьля

студэнтаў. Быў Кейзар Пракоп Савельевіч з Буда-Кашалёву. Забралі, і як камфара ў гарачай вадзе растварыўся...

Эдзік скарыстаў момант, калі Павел Пракопавіч на хвілінку замоўк, прапанаваў тост за яго здароўе, каб доўга жыў...

– А навошта доўга жыць? Псіхіка чалавека пад старасьць псуецца ў горшы бок: пасіўнасьць, абыякавасьць да ўсяго. Энгельс праўду гаварыў у “Дыялектыцы прыроды”: бялок патрабуе абнаўленьня. Старыя старэюць, каб маладыя жылі...

Аднекуль здалёк, як са сну, данёсься Нінін вясёлы голас:

– Ты недзе прапаў, і надоўга.

– Ага, прапаў. Зноў нешта ўспомнілася, – сур’ёзна пагадзіўся Адам. – А калі шчыра, то я прыехаў, каб пабачыць цябе... тую... з педвучылішча...

– Тую?.. – Ніна адвярнулася да вакна, прыкусіла ніжнюю губу. Пасядзела. Калі зірнула на яго – у вачах стаялі сьлёзы. – А я не хачу бачыць сябе “тую”, не хачу ўспамінаць сябе “тую”. Ты ня ведаеш, як цяжка мне ўспамінаць “тое”. Хаця, што ты ведаеш? Што вы ведалі? – сказала з надрывам. Сказала і зараз жа, нібы апраўдваючыся, дадала: – Вам здавалася: Ніначка ў масьле качаецца. Як жа: дзядзька – дырэктар, яго жонка – выкладчыца, чаму ж ёй не вучыцца... А я... Я была парабчанкай у іх. Парабчанкай, даражэнькі Адам.. Дзядзька за паляваньнем сьвету ня бачыў... Ён зьбягаў з дому, як толькі можна было зьбегчы. А паляваньне – добрая прычына таму. Колькі разоў было... Прыедзе ноччу з кампаніяй – я ўстаю, гатую есьці – дваім, траім, пецярым... Берта Сямёнаўна ніколі не ўставала. І не любіла гэтыя начныя паляваньні, і ленавалася. Як гэта яна ўстане сярод ночы! Памятаеш: у іх нарадзіўся хлопчык. Дзіця – гэта ж такая радасьць... Нарадзіць яна нарадзіла, але ня ведала ні выкупаць дзіця, ні спавіць, ні кашку зварыць. І ноччу ніколі не ўставала, да свайго дзіцяці не ўставала. Яно крычыць, а ёй хоць бы што. Я дрыжала над ім, я была ягоная мамка. Толькі ўжо калі ішла на заняткі, яна падзяжурыць ля яго, пакуль не вярнуся. Божа мой, як я зайздросьціла вам усім – і хто жыў на кватэрах, і хто ў інтэрнаце. Вы былі разам, а я ні з кім...

– Як жа ты пасьпявала? Ты ж добра вучылася.

– Так і пасьпявала: спала па дзьве-тры гадзіны ў суткі. Дзьве-тры гадзіны... Цяпер страшна нават успомніць. Сяджу на лекцыях і сплю. Думала, што ўжо ніколі ня высплюся. І зноў жа, Берта Сямёнаўна – такая важная, дагледжаная і... Такая скупая, такая чэрствая... Толькі табе і кажу гэта. Нават успамінаць ня хочацца. Ты зачапіў за жывое. Было, што дзядзька прыехаў з Менску, з нейкай нарады. Там хвалілі педвучылішча, і, вядома ж, дырэктара, і ён вярнуўся вясёлы, дзелавы, упэўнены... І прывёз мне чаравікі – чорныя, бліскучыя, “лодачкамі” называліся. Цяпер я ведаю: то былі самыя звычайныя чаравічкі, а тады яны мне здаваліся залатымі. Яе не было дома. Я прымерыла іх: якраз па назе. Прымерыла і не разулася: няхай ногі прывыкаюць... Прыйшла яна, убачыла іх і забрала: “Рана табе яшчэ такія насіць”. Гэта пры дзядзьку, і ён змаўчаў. Колькі я тады паплакала! Ня столькі лодачак тых было шкода, хаця і лодачак таксама, такіх у мяне ніколі не было, а болей за ўсё было крыўдна: хіба я іх не заслужыла, не зарабіла?

– Мне здавалася, што Сяргей Мікітавіч быў чалавек строгі, дысцыплінаваны, – заўважыў Адам.

– Строгі ў педвучылішчы – са студэнтамі, з выкладчыкамі, а дома...

Дома ўсім камандавала яна. Праўда, ён і не праціўіўся яе камандам, яму гэта было наруку. Як я цяпер думаю, ужо тады між імі не было нічога блізкага, сямейнага. Жылі кожны сам па сабе.

– “Сам па сабе” – гэта ты добра сказала. Сам сабе, сам па сабе...

– Што тут добрага?..

– Нічога. І ўсё-такі... Ён і яна. У педвучылішчы – заўсёды разам, такія важныя, такія салідныя.

– Педвучылішча – гэта праца, гэта людзі... Ня будзеш жа ўсім расказваць, што там у цябе дома... – падхапіла Ніна. – Ды і ў іх усё пачыналася прыгожа, рамантычна. Ну, што ты... Старобін, вялікае сяло на балоце. І тут прыязджае пасьля універсітэту – малады, высокі, прыгожы... І яна пасьля педвучылішча – зноў жа, рослая, чарнавалосая, вірлавокая. Я бачыла яе на фотакартках тых гадоў – вельмі прыгожая была. Сама старобінская, з паважанай яўрэйскай сям'і, і жаніх ужо быў – свой, местачковы. Бацькі згаворваліся, як пажаніць, як справіць вясельле па сваіх звычаях, па сваіх законах. І раптам... Прыходзяць аднойчы ў школу дзеці, а Берты Сямёнаўны і Сяргея Мікітавіча няма. Настаўнікаў няма! Прапалі. Праўда, праз дзень ці два маці Берты Сямёнаўны быццам бы знайшла запіску, што ў маладых настаўнікаў каханьне, ён без яе, а яна без яго жыць ня могуць, але разумеюць, што ў Старобіне ім не дадуць ні жыць, ні працаваць, і таму – даруйце і не карайце... Уцекачы праз нейкі час знайшліся на Магілёўшчыне, пад Асіповічамі. Абое спакойна працавалі ў школе і, як ні дзіўна, усё абышлося без вялікага скандалу: маладым паківалі пальцам і пакінулі на працы. Відаць, трапілі на разумных людзей. Што называецца: каханьне перамагло. Як стала вядома пасьля, маці Берты Сямёнаўны пра ўсе гэтыя тайны ведала, нават адзежу і пасьцель маладым адразу ж завезла. А тут вайна. Ён пайшоў у партызаны, і яна за ім. А куды ёй – і жонка, і яўрэйка. Так усю вайну і пераджылі: куды ён – туды і яна. Разам сьмялей, і ніхто ня ведае, што будзе заўтра, хто застанецца жыць, а каго зялёным дзёрнам засьцелюць. Так і выжылі. Ну а... пасьля вайны ён паспрабаваў быў адбіцца ад яе, ды не на тую натрапіў. Яна ў райкам. Ён камуніст, у начальстве, і яна ў партыі. У райкаме яму сказалі: выбірай – ці ўсё ціха-мірна, ці... сам ведаеш. А што “ведаеш”: турнуць з партыі і адусюль. І ён выбраў “ціха-мірна”... – Ніна памаўчала і раптам ускінула галаву, засьвяцілася вачамі: – А помніш, як вы з хлопцамі неяк зайшлі да нас. Пілі чай, сьмяяліся, потым мы з табой нечага пайшлі ў другі пакой, па пласьцінку, здаецца. І ты пацалаваў мяне і палез з рукамі, пачаў расшпільваць гузікі на маёй каўбойцы. Ня ведаю, што табе стукнула ў галаву... На мне была спартыўная каўбойка.

– Сіняя з бардовым... Бардовае ўгары. Ты мне тады яшчэ па мордзе зьезьдзіла, – усьміхнуўся Адам.

– А ведаеш, чаму?

– Ты заўсёды была непадступная.

– Непадступная. Усё так і ня так... Цяпер я ўжо магу табе сказаць такое: на мне тады акрамя той каўбойкі нічога не было. Каўбойка на голым целе. Была кашуля, я яе памыла, і тут ты са сваімі рукамі... – Ніна кінула позірк на ягоныя рукі. Складзеныя разам, белыя, з тонкімі сінімі пражылкамі, яны, як нежывыя, ляжалі на стале. Яна паклала сваю руку на іх, пажартавала: – Па-мойму, тады яны ў цябе былі большыя, чым цяпер. – Уба-

чыла, што жарты да яго цяжка даходзяць, спытала: – Ты мяне проста так шукаў, ці цябе прывяло сюды нешта?

– Нешта – гэта нішто, – адказаў ён грубавата, і яна зразумела, што ён зноў аддаліўся ў сваё “некуды”. Ён дадаў, быццам прабачаўся: – Рады, што ў цябе ўсё добра склалася. Цяпер мала хто можа гэтым пахваліцца.

– Хваліцца, можа, і ня трэба, і я баюся хваліцца. А ведаеш што: пайшлі да мяне... Я пазнаёмлю цябе з сынам, з мужам, ён ужо недзе вярнуўся з працы. Яны табе спадабаюцца.

– Як-небудзь іншым разам.

– Ты ня бойся, ён у мяне не раўнівы.

– Інакшым я яго і не ўяўляў, – усміхнуўся Адам.

– У цябе нешта здарылася?.. – насьцярожылася яна.

– Здарылася?.. Не, нічога ня здарылася – сказаў ён, нібы раздумваючы. – Раскажы пра сябе: як праца, як дзеці? Кажу пра школьнікаў: яны табе падабаюцца, ты іх любіш?

– Хіба могуць дзеці не падабацца? Мае дзеці... Я іх люблю, і яны мяне любяць. Ведаеш, гадоў з дзесяць назад я зьбіралася паступаць у педінстытут, нават рыхтавацца пачала. Думаю: ну няўжо я дурнейшая за іншых? Вунь нашы ўсе, ну ня ўсе, дык многія, паканчалі – хто інстытут, хто ўніверсітэт, хто ў дырэктары пайшоў, хто ў завучы, а я ўсё з імі, пачаткоўцамі... І якраз тады да нас пастукалася бяда... Я кажу, што сёньня ў мяне ўсё добра, а тады... Захварэў муж, мой Віця, і так захварэў, ня дай Бог нікому. Вясной паспаў на сырой зямлі і застудзіў сьпінны мозг. Параліч, ні рукой, ні нагой ня можа паварушыць. Лялька, вялікая лялька на ложку. Толькі вочы блішчаць, як сьветлякі. Дактары адступіліся. Хаця, што дактары, у іх свае законы: лечыцца – яны лечаць, а ня лечыцца – забірайце дамоў. А як дамоў, куды дамоў? У мяне школа, чацьвёрты клас, сваё дзіця. І вось тады прыйшлі людзі... Да гэтага я ня ведала, што гэта такое – людзі і што людзі могуць быць такімі.

– Якімі?

– Такімі... Добрымі, чулымі, спагаднымі. Столькі гадоў у школе, лічы, усё жыцьцё з дзецьмі, з бацькамі, а ня ведала... А гэта шэсьць месяцаў, дзень у дзень... Правяду ўрокі – і на аўтобус, у Менск, да яго. Сяджу ля хворага, а душа разрываецца: як там дома Валік?.. Дзіцянё, чацьвёрты клас, яшчэ газ ня ўмее ўключаць, а ўжо мусіць і варыць сабе, і ўрокі рабіць... А ноччу зноў – апошнім аўтобусам назад, дамоў. Прыязджаю: сын ня сьпіць, мяне жджэ. У кватэры ўсё прыбрана, вячэра зварана. Сынок мой, сынок! Ем я тыя макароны ці вермішэль, бо што яшчэ ён можа прыдумаць? – ем, а сьлёзы засьцілаюць вочы. І ўжо другое: як там той, Віця? Мы тут здаровыя, удваіх, а ён там адзін, і нічым памагчы сабе ня можа... І вось тады... Гэта ўжо месяцы два было, як ён ляжаў у бальніцы, прыходзяць да мяне дзьве жанчынкі – маці маіх вучняў. І вучні не выдатнікі, дзеці як дзеці. Прыходзяць і прыносяць грошы ў канверце. Гавораць: “Вазьміце, гэта бацькі сабралі”. Я табе скажу, Адам, бывае такое, што калі і ня ўмееш плакаць, дык навучышся. Так і я. Яны паклалі грошы на стол і пайшлі, а я сяджу і плачу. Дактары гавораць: “Нічога ня будзе – застуджаны мозг, пашкоджаны ўсякія цэнтры, вы ж самі бачыце, два месяцы – і хоць бы які зрух, усё мёртвае, мёртвае, мёртвае”... Бачыць я бачу, а верыць не хачу. І тут гэтыя жанчыны, і гэтыя грошы, і словы: “Не адчайвайцеся, усё будзе добра”... Плачу і сама хачу верыць, што ўсё будзе добра, і веру,

што так будзе. І злуюся на дактароў, якія ня бачаць, ня вераць, што ўсё будзе добра. Жанчынкі гавораць, што яны вырашылі на бацькоўскім савеце дапамагаць нам па чарзе... Будуць падмяняць мяне, пакуль я буду езьдзіць туды-сюды. Паехала я назаўтра ў Менск і ўсё гэта расказала Віцю. Хай усё ведае, ну не магу я адна гэта цягнуць... І ён заплакаў. Заскрыгатаў зубамі, застагнаў і... заплакаў. Ляжыць, пазірае на мяне, а ў самога сьлёзы бягуць з вачэй. І вочы, вочы... Ня ведаю, што яго паправіла, а можа, паправіла мая злосьць. Прыходжу аднойчы ў клас, было гэта перад Жаночым днём, перад 8 сакавіка, недзе на вясну зьбіраецца, а стараста класа падносіць мне кветкі і канверт. Гаворыць: "Гэта мы сабралі..." Я вярнула канверт, кажу, "Што вы, дзеці... Як жа я магу ўзяць?.." А яны сядзяць за партамі і пазіраюць на мяне. І ўсе такія сур'ёзныя. Я ведала, што дзеці мае харошыя, усе дзеці харошыя. Іх трэба любіць, каб яны былі харошыя. Але тут я ўбачыла, якія яны сур'ёзныя, якія яны дарослыя. Яны адкладвалі капейкі – з тых, што бацькі давалі на абеды, на кіно, на марожанае, каб сабраць мне, нам... Я заплакала і выскачыла з класу... Зачынілася ў пустым кабінеце і зноў дала волю сьлязам. І тады паверыла, што падыму яго. Быць таго ня можа, каб я не падняла яго.

З тым і прыехала да яго, і расказала яму пра ўсё. Мне хацелася, каб ён раззлаваўся. Раззлаваўся на сваю хваробу, на сябе, на сваю бездапаможнасьць, на сваю бязвольнасьць. Мне здаецца, на вайне немагчыма бяз злосьці, на вайне заўсёды павінна быць злосьць, а вайна з хваробай – гэта, можа, самая страшная з войнаў, бо гэта вайна з самім сабой. І я яго раззлавала.

Я яму сказала: "Ты павінен жыць, як жыў дагэтуль. Ня можаш гэтага рабіць фізічна, – рабі ў думках, у галаве, ты павінен гэта рабіць. Рабіць, быццам нічога не зьмянілася. Прачнуўся: устань, зрабі фіззарадку, пагаліся, памыйся. Ты павінен сам есьці, сам садзіцца, сам уставаць, сам хадзіць. Усё сам, сам, сам!.. Інакш табе сорамна будзе перад сабой, перад дзецьмі, якія... якія... якія... – Ніна расхвалявалася, зaружавелася. Яна зноў перажывала ўсё так, быццам тое, пра што расказвала, адбывалася толькі што. І голас яе зьвінеў так, нібыта яна ўсё яшчэ працягвала гаварыць з ім – бездапаможным, хворым чалавекам. У нейкі момант яна сама пачула свой голас і асеклася, вінавата зірнула Адаму ў вочы. І ў Адамавых вачах убачыла нешта жывое, быццам нейкі агонь, быццам нейкая іскра мільганула ў іх. І прапала. І зноў пустата. Быццам не было нічога. Ці чуў ён хоць што-небудзь з таго, пра што яна гаварыла? Яна зноў дакранулася да ягонай рукі:

– Гэта я так... Ты спытаў: як праца, як дзеці... Я табе і сказала: так праца, так дзеці...

– А ведаеш, што мне яшчэ ўспаміналася, – сказаў ён, крыху памаўчаўшы. – Мы езьдзілі "на бульбу", помніш?

– Ці помню я? Сяло, бярозы... Лавачка пад бярозай...

– Лавачка пад бярозай, і двое на лавачцы...

– І адзін чалавек зьдзеў з сябе пінжак і накінуў на плечы другому, якога чамусьці зваў "сіньярыта"...

– І праўда, чаму?.. – зноў нешта жывое зьявілася ў Адамавых вачах. – Чаму?..

Сяло стаяла на пясчаным касагоры, і дарога між хатамі, і сама вуліца глыбока ўразаліся ў яго схіл, нібы для таго, каб паказаць, якое багацьце

чыстага залацістага пяску схавана пад тонкім насьцілам верхняга грунту – чорнай зямлі і неперагнілых карэньчыкаў.

Вельмі прыгожыя ў сяле былі бярозы. Старыя, высокія, раскідзістыя, высаджаныя нібы пад шнурок перад хатамі, яны рэдкім строем ішлі ўздоўж вуліцы і далей за сяло, спускаючы галіны так нізка, што месцамі даставалі да самай зямлі. Прывялае, мяккае лісьце нячутна сыпалася зьверху, усьцілаючы залацісты пясок, па якім так добра было ступаць. Жоўтае, як і гэты пясок, яно пахла нечым сырым, адміраючым, асеньнім.

Пры спакойнай яснай пагодзе аднойчы раптам наляцеў шалёны вецер, расшкуматаў на полі сьцірты з саломай, паваліў некалькі электраслупоў, парваўшы правады, і пайшоў гуляць далей, пакінуўшы вёску без сьвятла.

У адзін з тых вечароў дзяўчаты надумаліся пякчы дранікі. Адны абіралі бульбу, другія дралі, а Ніна стаяла пры печы і на трох вялікіх патэльнях пякла дранікі. Нехта прынёс сала, нехта сьмятаны, хлопцы раздабылі дзьве пляшкі самагонкі...

Была субота, гаспадыня сышла на сяло, пакінуўшы іх адных, і гэта было вельмі дарэчы. У печы гулка гарэлі сухія дровы, жар быў такі, што даставаў аж да сьцяны насупраць прыпечку. У кутку хаты над сталом гарэла падвешаная лямпа, там хлопцы гулялі ў “дурня”, а ва ўсёй хаце стаяў паўзмрок, нібы хаваючы нейкую таямніцу.

Ніна расчырванелася ад жару. Ёй прыемна было слухаць, як сквірчыць, падаючы на разагрэтую патэльню, туга адцэджанае цеста, як потым яно на вачах цьвярдзее, бялее, ружавее і, паджуранае зьверху і са споду, робіцца пыхкімі апетытнымі аладкамі і іх усё более і более ў прадаўгаватых ліповых начовачках. І патэльні, і начовачкі дала гаспадыня – лёгка і шчыра. Невядомая прыгажосьць і спрыт раптам адкрыліся ў Ніеных руках, у яе рухах, быццам яна ўсё сваё жыцьцё толькі і рабіла, што стаяла ля печы, і ёй падабалася такое стаяньне. Яна і сапраўды на нейкі момант адчула сябе гаспадыняй у гэтай хаце. І нібыта не студэнты-аднакашнікі сядзяць за сталом на покуце і на лаўцы паўз сьцяну, а гэта яе госьці, суседзі, і сярод іх яе мужык і мужык гэты Адам. Гавораць пра свае справы, але ўсе чакаюць, калі яна паставіць усё на стол і можна будзе пачынаць застольле.

Адчуваньне гэтае прыйшло да Ніны ўсяго на нейкае імгненьне і гэта нават было не адчуваньне, а згадка пра яго, але было яно такое вострае і грэшнае, што яна аж азірнулася, ці не заўважыў хто гэтае яе “нешта”. Усе былі занятыя – хто картамі, хто гаворкай, і толькіАдам сустрэў яе позірк. Усьміхнуўся, устаў з-за стала, падышоў, нібыта для таго, каб паглядзець, што там творыцца ў печы, дакрануўся да яе плечука. Сказаў: “А я і не ведаў, што ты такая ўвішная гаспадыня”. Сказаў ціха, але такім голасам, быццам прызнаваўся ў нечым інтымным. “Ай, якая гаспадыня”, – засаромелася яна і павярнулася да агню, баючыся, каб ён ня ўбачыў, што твар яе загарэўся яшчэ большай чырваньню.

Потым елі дранікі, пілі самагонку, танцавалі пад транзістар, пасьля вываліліся на вуліцу і расьцякліся, хто куды, – па двое, па трое...

Яны з Адамам завярнулі ў нейкі завулак, выйшлі ў поле. У небе плыў вялікі месяц, жнеўнік іскрыўся ў белым мроіве, разьмякчаны, адсырэлы, ціха шаргацеў пад нагамі. Было прахалодна. Адам накінуў ёй на плечы свой пінжак. Пінжак і яму быў завялікі, а Ніне даставаў да самых каленяў,

і яна выглядала ў ім птушкай з маленькай галоўкай, шырокімі плячамі і даўгімі крыламі. Адам прыгарнуў яе да сябе, і Ніне гэта спадабалася, ён знайшоў яе вусны, пацалаваў – і гэта ёй таксама спадабалася. На яе быццам найшло нейкае ачмурэньне. Ці то белы месяц і белая ноч былі таму віной, ці так што... Такія ночы не паўтараюцца. Яны вярнуліся ў сяло, прыселі на лавачку пад бярозкай, галіны хадзілі па зямлі, быццам расьлі з яе. Нацалаваліся, аж губы паўспухалі... Разышліся пад раніцу. Назаўтра, ужо калі вярталіся з поля і Адам пры ўсіх паспрабаваў жартам узяць Ніну пад ручку, яна ўспыхнула, адштурхнула яго. Так і ішлі: яна з дзяўчатамі, ён з хлопцамі за імі. Усю дарогу ў сяло яна адчувала на сабе ягоны запытальны позірк. Страшэнная гэта справа – жаночыя капрызы. Паспрабуй прачытай іх... Думала вечарам сказаць яму, што так няможна, непрыгожа, адно – калі яны ўдваіх, другое – на людзях. Вечарам пад тую бярозу ён не прыйшоў: сышоў з хлопцамі на танцы ў суседняе сяло. Хто быў завадатарам таго паходу – невядома, але Ніне здалося, што гэта быў Адам. Яна так рашыла. Тая белая ноч доўга сьнілася ёй пасьля і ўспаміналася як нейкі важны вузельчык на нітачцы жыцьця, які мог нешта зьвязаць і не зьвязаў.

Пасьля бульбы ні Адам, ні Ніна не падавалі выгляду, быццам між імі нешта адбылося. Дранікі, белае поле, лавачка пад бярозай, некалькі пацалункаў?.. І ўсё? Можа, усё, а можа, і ня ўсё. Відаць, ня ўсё.

– А мне яшчэ ўспамінаецца наша насьценгазета. Помніш, яна вывешвалася за дошкай аб’яў. Мне запомніўся адзін верш з яе. Хочаш, прачытаю?

– Прачытай.

– Толькі спачатку вып’ю для сьмеласьці. – Ніна ўзяла фужэр, паглядзела праз яго на акно. Густа чырвонае віно калыхалася ў фужэры, з ім калыхалася і акно, і сьвятло за акном. Ніна дапіла віно, трошкі счакала і не прачытала, а прашаптала, як нешта сваё, таемнае:

Калі першы раз спаткаўся,
У глыбіню вачэй зірнуў,
Я тады сябрам прызнаўся,
Што прапаў, што патануў...
І ад кожнага спатканьня
Я іду глыбей на дно.
Не відно выратаваньня –
Ды й навошта мне яно...

– Ты ня ведаеш, хто і пра каго напісаў гэты верш? – спытала ў Адама.

– Ведаю... Хаця і ты, відаць, здагадваешся... Падымаюся на другі паверх, туды, дзе тая насьценгазета, а ля яе дзяўчаты. Нешта чытаюць... І так, каб усе чулі... І сьмяшкі... Я, як злодзей, назад... Нейк прыкра стала. Ці то сам украў, ці ў цябе ўкралі...

– Што ты! А мне верш спадабаўся.

– Спадабаўся? То чаму ж не сказала тады?.. – Памаўчаў, уздыхнуў: – Як даўно гэта было. А можа, усё гэта прысьнілася?..

– Сон прыходзіць у адну галаву, а ў дзьве адначасова?.. Гэта ўжо нешта іншае...– Ніна паглядзела некуды ўбок, перавяла вочы на Адама. – З усёй нашай вучобы, пасьля таго, як усіх нас раскідала каго куды, мне часьцей за ўсё ўспамінаўся навагодні вечар трэцяга курса...

– Трэці курс, трэці курс... – наморшчыў лоб Адам. – А-а-а... Вечар быў у спартыўнай зале. Справа высока вокны, зьлева – шведская сьценка...

ля каторай на крэсьле сядзіць Сінькевіч з баянам... Да таго вечара я ня ведаў, што ён яшчэ і баяніст.

– Я то ведала. Ня часта, але ён заходзіў да дзядзькі. Выпівалі, успаміналі партызаншчыну... У дзядзькі быў трафейны баян, і Сінькевіч браў яго ў рукі і пачынаў іграць. Ён быў вельмі сентыментальны...

– Ага... Мы з табой яшчэ танцавалі на тым навагоднім вечары, – працягваў Адам.

– Першы і апошні раз...

– На табе была белая кофтачка з вышытым адкладным каўнерыкам, расклёшаная чорная спадніца...

– Як ты добра ўсё помніш... – ня то з горыччу, ня то з трывогай прагаварыла Ніна.

Адам сапраўды да драбніцаў помніў той вечар... Сам ён стаяў бліжэй да сьцяны, за сьпінамі сьмялейшых студэнтаў. На ім быў выцерты шавётавы касьцюм, начышчаныя гуталінам чаравікі. І хоць чаравікі блішчэлі, а касьцюм быў старанна адпрасаваны і пад ім была чыстая белая кашуля, адчуваньне сваёй беднасьці сьціскала душу і не давала радасьці разгарнуцца на поўную сілу. Ніна ў шчыльнай купе дзяўчат была па другі бок залы. Яна бачыла яго, ён бачыў яе, іх позіркі не-не ды і сустракаліся. Яму хацелася быць побач з ёй і страшна было стаць побач...

Сінькевіч іграў без супынку. У ягоных дужых руках баян глядзеўся вялікай бліскучай цацкай, з якой саліднаму дзядзьку ў строгім цёмным касьцюме прыемна было забаўляцца... Ягоныя доўгія белыя пальцы так лёгка і далікатна гулялі па чорных кнопачках галасоў і падгалоскаў, і гэтая гульня ператваралася ў нешта рытмічна-галоснае і зазыўнае, што трывожыла душу. Вальс, полька, кракавяк... Калі Сінькевіч зайграў чарговы вальс, то былі “Дунайскія хвалі”, Адам рашыўся і перасек яшчэ вольную ад танцораў прасторную залу. Ён з цяжкасьцю помніў, як падышоў да Ніны, як пачынаўся іхні танец, адно помніў, што танцавалася ім лёгка, яны добра раскруціліся, і на нейкім развароце Ніну пачало адрываць ад яго, ён мацней прыхапіў яе рукамі, прыціснуў да сябе і адчуў яе грудзі – гарачыя і цьвёрдыя, як кулакі. Быццам ток ударыў яму ў галаву, ён аж задыхнуўся, і ўжо мала помніў, як яны датанцавалі танец, як ён адвёў Ніну да дзяўчат, як вярнуўся да сваёй сьцяны...

– А ці ведаеш ты, што Сінькевіч памёр? – ціха спытала Ніна.

Адам уздрыгнуў, быццам яго нечакана стукнулі, цяжкім позіркам утаропіўся ў яе.

– Чаго ты так глядзіш на мяне? – сумелася яна.

– Чаго гляджу?.. Я якраз думаў пра яго.

– Нават так... – Ніна ўсё не магла адысьці ад ягонага гнятучага позірку. – Памёр... На пахаваньні было шмат людзей... Можна сказаць, увесь горад праводзіў яго.

– Я ня ведаў, а то абавязкова прыехаў бы. Думаю, і многія з нашых...

Ніна горка ўсьміхнулася:

– На пахаваньне, можа, і прыехалі б. А да жывога...

– Я помню яго жывога.

– Я не пра цябе, я наогул... Людзі толькі зблізу бачаць адзін аднаго, ці робяць выгляд, што бачаць. А аддаліліся – і ўсё абрываецца... Абрываецца ці самі абрываюць. Як у нас з табой. Нешта ж у нас з табой было ці магло быць... А разьехаліся – і ўсё...

– Гэта праўда, нешта было, – паўтарыў усьлед за Нінай Адам. Можа, таму і я сёньня тут... Падумаў і дадаў: – А можа, і магло быць...

Магло быць, а не збылося... Атрымаўшы накіраваньне і прыехаўшы ў “сваю” вясковую школку, Адам напісаў Ніне пісьмо – адно, другое, трэцяе... Ніна адгукнулася адразу. І было ў яе лістах і цяпло, і адкрытасьць, быццам яна хацела дагаварыць тое, што не пасьпела сказаць, калі вучыліся. Адам зьбіраўся на першых жа канікулах прыехаць да яе, “праверыць, як яна там ганяе сваіх няшчасных дзетак”, спрабаваў нават уявіць, як усё гэта будзе выглядаць... Але ў ягоныя планы ўклініўся ваенкамат і паслаў далей ад дому і ад усяго, чаму Адам вучыўся і да чаго рыхтаваўся. Армія не пытаецца ні пра тваю згоду, ні пра твае жаданьні.

З войска Адам напісаў Ніне два лісты, але адказу ні на адзін не атрымаў: мо таму, што на пачатку службы яго перакідвалі з месца на месца, а мо... Для сябе Адам рашыў, што гэта невыпадкова: у яго тры гады салдацкай невядомасьці, у яе канкрэтныя жаночыя задачы – школа, дзеці, замужжа... Нітачка, што зьвязвала іх, перарвалася, і ні ў яго, ні ў яе не знайшлося волі пашукаць перарваныя кончыкі, каб паспрабаваць зьвесьці іх разам. Час ішоў гадамі, аддаляючы гэтыя кончыкі далей і далей, і тое “нешта”, што некалі было ў педвучылішчы, успаміналася ўжо як нейкая казка, у якой яны выступалі ці то як дзейныя асобы, ці ўсяго як слухачы... Чужыя слухачы ў чужой казцы...

Ніна пазірала на Адама, нечага чакала. Не дачакалася.

– Скажы, як ён памёр? – глуха, з нейкай сваёй далечыні, спытаў Адам.

– Памёр проста. Апошні час яму было вельмі цяжка. Я гэта добра ведаю, ён жа быў маім дырэктарам. Ён ніколі не маўчаў, калі трэба было гаварыць. А калі ты сапраўдны дырэктар, доўга не намаўчыш. Я слухала яго, калі ён выступаў на раённай нарадзе, а як ён умеў выступаць, ты ведаеш. Што ні слова – усё супраць бясконцых эксьпэрыментаў над дзіцячай душой, у абарону народнай маралі, у абарону настаўнікаў. Пасьля таго выступленьня ў школе пайшлі праверкі, пераправеркі. Што можна шукаць у школе, у лепшай у горадзе школе? Нешта знайшлі, за нешта зачапіліся. Абвінавацілі ў самавольлі: яшчэ адзін Сухамлінскі знайшоўся!, – у парушэньні фінансавай дысцыпліны. Шмат ёсьць дысцыплінаў, але самая страшная – бюракратычная. Ён купляў старыя тэлевізары, рамантаваў іх і ставіў у класы, у кожным класе тэлевізар, каб можна было дзецям паказваць урокі лепшых настаўнікаў, кінафільмы, лекцыі... У старэйшых класах вучні самі вялі ўрокі, і гэта яму запісалі ў віну. Словам, білі і дабілі... – Ніна змоўкла.

Маўчаў і Адам. Неаднойчы ён успамінаў Сінькевіча, але самым яркім успамінам застаўся ягоны першы прыход у іхнюю аўдыторыю.

...Празьвінеў званок, яшчэ ня ўсе ўселіся, супакоіліся, і раптам шырока расчыняюцца дзьверы, і ў праёме іх спачатку паказваецца высока ўзьнятая нага ў чорным чаравіку мо сорак пятага, мо большага памеру, апісвае дугу да падлогі. За нагой ўвальваецца цела высокага чорнавалосага мужчыны. Падцягваецца другая нага, і ўсе бачаць, што гэта пратэз. У левай руцэ ў мужчыны вытачаная палка, на якую ён абапіраецца, у правай – журнал. Шырокі і сьмелы, нібыта мужчына на дзьвюх здаровых нагах, крок ад дзьвярэй, журнал ляціць на выкладчыцкі стол.

– Добры дзень, завуць мяне Лаўрэн Міхайлавіч Сінькевіч, я буду весьці ў вас гісторыю, сёньняшняя тэма – грамадзянская вайна, палітыка ваен-

нага камунізму, адказваць пойдзе Васіль Козел... – Лаўрэн Міхайлавіч робіць два наступныя крокі да стала, садзіцца, умошчвае пратэз, а ля дошкі ўжо стаіць Васіль Козел, зьбянтэжана пазірае на новага выкладчыка і пачынае нешта расказваць...Скончыў гаварыць, змоўк. І тут нечаканае пытаньне:

– У вас у сяле ўсіх людзей вашага прозьвішча клічуць так – Козел? Я кажу пра націск.

Васіль маўчыць. Лаўрэн Міхайлавіч паварочвае твар да ўсіх.

– У нас, адкуль я родам, таксама ёсьць такое прозьвішча, толькі прамаўляецца яно ня Козел, а Казёл... Казёл дык Казёл. Ня трэба саромецца свайго прозьвішча, яно дасталося ад бацькоў, прозьвішча – яшчэ не чалавек, хаця і чалавек таксама... Але гэта не па сёньняшняй тэме. Сядайце... Другое пытаньне...

І пайшло, і закруцілася... Адведзеных на лекцыю сарака пяці хвілінаў Лаўрэну Міхайлавічу хапіла і на праверку старога матэрыялу, і на тлумачэньне новага, і на беглае апытаньне, і на замацаваньне... І так было кожны раз. У яго не было ні любімчыкаў, ні нелюбімчыкаў. Яго ўрока чакалі, як сьпектаклю, і рыхтаваліся, як да бою. І калі прыйшоў час экзамену, ён правёў яго, як сьпектакль. Заходзяць студэнты ў кабінет гісторыі, а па перыметры сьценаў расстаўленыя сталы, і на іх альбомы, кнігі, часопісы, на сьценах паразьвешаныя карты, схемы, дыяграмы, нават падручнік ляжыць. Цягні білет і карыстайся ўсім гэтым багацьцем. Тут нават той, хто ні разу ня быў на ягоных уроках, нават самы апошні гультай ня мог ня здаць.

– Акрамя ведаў па гісторыі ён даў мне яшчэ адзін урок, і яго я запомніў на ўсё жыцьцё, – глуха зазначыў Адам..

– Ён быў рэдкі педагог, – па-свойму зразумела Адамавы словы Ніна.

– Рэдкі...

На нейкі час замоўклі абое.

...Адам жыў тады ў інтэрнаце на вуліцы Вечаркевіча. Шасьцёра ў адным пакоі, пяць дзетдомаўцаў і ён, не прыпісаны ні да якага дзіцячага дому.

Толькі маладому целу і маладой душы ўласьцівы аптымізм аднаго дня: сёньня паеў, – і, можна жыць далей і радавацца. Так было і ў іх – радзей наядаліся, часьцей недаядалі. Усё ішло ў чаргаваньні і ўспрымалася як заканамернасьць, як зьмена часінаў году: за зімой прыходзіць вясна, а з вясной цяпло і сонца...

Самымі цяжкімі былі дні перад стыпендыяй. Здаралася так, што канчалася ўсё – і прадукты, і грошы, і канчалася ва ўсіх. Заставаўся пусты чай і спадзяваньне, што некаму нешта аднекуль перападзе. Ці з радні хто ўспомніць, ці з суседзяў.

Тым разам выратавальнага круга ніхто нікому ня кінуў, і яны заляглі ўсім пакоем. На заняткі ніхто не хадзіў. Праляжалі двое сутак, да стыпендыі заставалася яшчэ двое. Гэта было так далёка, усе разумелі, што ня вытрымаюць столькі ляжаць і чакаць. Чаго чакаць? У каторы раз пачыналі прыкідваць, у каго пазычыць грошай? Пазычыць можна было толькі ў выкладчыкаў, у студэнтаў нічога ня знойдзеш.

Зноў жа, каму ісьці ў пазыкі? Ісьці выпала Адаму: ён вучыўся лепей за астатніх пакаёўцаў і да выкладчыкаў з такой бядой ні разу не зьвяртаўся.

Пакуль ішоў да педвучылішча, напружана перабіраў у галаве: да каго падысьці з гэтай страшнай просьбай. Падысьці і быць упэўненым, што ў чалавека будуць з сабой грошы, і што ён не адмовіць.

Выбар лёг на Сінькевіча. Адам чамусьці быў упэўнены, што ён не павінен адмовіць і грошы ў яго ёсьць.

Дарога да педвучылішча здалася як ніколі доўгай і цяжкай. Дрыжалі ногі, дрыжала ўсё ў жываце, Адама пачынала ванітаваць. Два дні ў роце акрамя вады нічога не было, а яго мучыла печая і кіслая адрыжка. Быццам пераеў сальнага.

У педвучылішча ён падгадаў прыйсьці перад канцом урока і стаў ля акна ў маленькім калідорчыку. Тут была свая хітрасьць: калі яго раптам убачыць нехта з выкладчыкаў, то можна зрабіць выгляд, быццам ён толькі што выйшаў з аўдыторыі – прынесьці карту ці намачыць анучу, каб сьцерці мел з дошкі. Сінькевіч вёў заняткі ў кутняй аўдыторыі, і вяртацца ў выкладчыцкую будзе па гэтым калідорчыку. Галоўнае, каб не запазьніўся і выйшаў адзін. Сьпіной, усім сваім целам Адам адчуваў холад і скразную пустату калідору, глухую цішыню якога нарэшце ўзарваў металічны голас званка.

Сінькевіч быў пунктуальны, выйшаў разам са званком. Некалькі важкіх шырокіх крокаў – і вось ён ужо на павароце. Адам ступіў яму насустрач.

– Лаўрэн Міхайлавіч, можна вас на хвілінку? – Адам стараўся гаварыць лёгка, нават весела: падумаеш там важнасьць – папрасіць нейкую дзясятку... Але на тым ягоная сьмеласьць і скончылася: голас здрадліва задрыжаў, у роце стала суха.

– Канешне, можна. – Лаўрэн Міхайлавіч азірнуўся: за ім з аўдыторыі выходзілі студэнты. – Давайце лепш адыдзем да акна, каб нікому не замінаць.

Які ён усё-такі малайчына, гэты Лаўрэн Міхайлавіч. Сам дапамагаў Адаму. Ля акна Адам адразу пайшоў у атаку:

– Я хачу ў вас папрасіць... мне трэба... дзесяць рублёў... – прамовіў Адам самыя цяжкія словы і змоўк, затраўлена пазіраючы выкладчыку ў твар.

Бровы Лаўрэна Міхайлавіча зьдзіўлена папаўзьлі ўгору.

– Гэта толькі да стыпендыі, пасьлязаўтра я іх вам вярну...

Самае страшнае было зроблена: ён сказаў тое, што трэба было, і цяпер чакаў прысуду. І як малітву паўтараў сам сабе, што Лаўрэн Міхайлавіч павінен зразумець, што грошы Адаму вельмі патрэбныя, што бяз грошай ён ня можа вярнуцца ў барак. А ў Лаўрэна Міхайлавіча грошы ёсьць, гэта відно па ім, трэба толькі іх выманіць.

– Пачакайце... – Лаўрэн Міхайлавіч ступіў бліжэй да Адама, нібы для таго, каб лепей бачыць яго. Яны стаялі адзін проці другога: высокі прамы Сінькевіч, адставіўшы ўбок цяжкую палку, і нашмат меншы, схуднелы і нібы прышпілены да падлогі строгім позіркам, Адам.

– Пачакайце, – паўтарыў Лаўрэн Міхайлавіч. – Навошта вам грошы? Выпіць?..

Адам адчуў, як у яго задрыжалі губы. Хацелася павярнуцца і бегчы, куды вочы глядзяць. Ён нават зрабіў нейкі рух убок ад акна, але застаўся на месцы. Куды ты пабяжыш? Чакай свайго...

– Я... мы... мы ўжо двое сутак нічога ня елі... – не прагаварыў, прашаптаў Адам.

– Пастойце, хто “мы”?

– Я і хлопцы з дванаццатага пакоя. Яны там, у інтэрнаце на Вечаркевіча...

Нейкі час Лаўрэн Міхайлавіч пазіраў на Адама, як аглушаны, потым

засьпяшаўся, палез ва ўнутраную кішэню пінжака, дастаў скуранoе партманэ, разгарнуў, узяў дзясятку, працягнуў Адаму:

– Можа, яшчэ?

– Не, вялікі дзякуй. Нам хопіць дзясяткі... А са стыпендыі я... мы вам вернем...

Адам схапіў дарагую каляную паперчыну і не пайшоў, а рвануў па лесьвіцы ўніз, на выхад. Дарога ў інтэрнат была нашмат лягчэйшая і карацейшая. Як загарэліся вочы ў хлопцаў, калі ён заявіўся з той дзясяткай!..

Хлеб прадавалі ў дашчаным харчовым павільёнчыку ў парку. Прадаўшчыцай там працавала паўнацелая шыракатварая Зося – сьпела-аўсяныя валасы, прыемная спагадлівая ўсьмешка. Хлеб яна падавала праз фортку ў невялікім, забраным кратамі акенцы. Фортка была прарэзаная высока, ледзь не на ўзроўні галавы, і ў час прывозу хлеба самыя важныя падзеі адбываліся тут, на гэтым невялікім пятачку перад акенцам, дзе людзі займалі чаргу з поўначы, а то і з вечару. Хлеба ўсім не хапала. Браліся загрудкі, здараўся мардабой. Патрэбныя былі рэдкае ўмельства ці сіла, каб прабіцца да акенца і прасунуць у фортку руку з грашыма. Галоўнае, каб рука была там і каб яе не адцёрлі. А каб гэтага не здарылася, купляць хлеб ішлі гуртам, выстройваліся ланцужком паўз сьцяну павільёна, падпіхваючы да акенца некага аднаго. Сярод працягнутых да форткі рук Зося заўсёды ўмела заўважыць руку з іхняга пакоя. А калі галодная людская стыхія пачынала вадзіць гэтую руку то ў фортку, то ад форткі, Зося магла і прыкрыкнуць уладным голасам: “Вы што, людзі, з розуму павыжывалі? Студэнціка задушыце!” І людзі слухаліся гэтага голасу.

Ад паходу ў харчовы павільён Адама аслабанілі: ён сваё зрабіў. Пайшлі ўсе, хто быў у пакоі. Гадзіны праз тры вярнуліся з камсой і трыма вялікімі фармавымі буханкамі сітняга хлеба. Заварылі чай, наеліся за ўсе галодныя дні.

Грошы Лаўрэну Міхайлавічу Адам, як і абяцаў, вярнуў у дзень выдачы стыпендыі. Ці Адаму падалося, ці яно і праўда было так, але Лаўрэн Міхайлавіч выглядаў зьбянтэжаным.

– Далі стыпендыю? Ну і добра, добра, – прагаварыў ён, пасьпешліва сунуўшы грошы ў кішэню пінжака. – Можа, вам яшчэ трэба будзе, то вы ня бойцеся, скажыце...

Патрэба ўзьнікала неаднойчы, але з такой просьбай да Лаўрэна Міхайлавіча Адам болей ніколі не зьвяртаўся. І тады, і праз многія гады тую пазыку Адам успамінаў з пякучым сорамам. Ня мог дараваць сабе прыніжэньня, якое перажыў. Ня мог дараваць і Лаўрэну Міхайлавічу ягонага недаверу і сумненьня. Чалавек з сухімі ад голаду вачамі дрыжачым голасам просіць міласьціну ў другога чалавека, а той ня верыць у шчырасьць яго просьбы.

– Ён хварэў? – спытаў Адам сухім голасам.

– Як усе інфарктнікі... У школу прыйшоў сам, а са школы павезьлі...

– Ты пакажаш мне яго магілу?

– Канешне, пакажу.

Дарогу на могілкі Адам помніў. З цэнтра гораду туды вялі дзьве даўгія вуліцы, адна з якіх заканчвалася бальніцай. За бальніцай, за невялічкім скверам, пачынаўся іншы горад – горад памерлых – са сваімі вуліцамі і

завулкамі, са сваім глухім, маўклівым жыцьцём. Такім ён помніўся Адаму. Такім быў і цяпер.

Магілу Сінькевіча Ніна знайшла хутка. Цэнтральны праход, паварот налева, да маладой бярозы – адзінокай на гэтым вечным прыстанішчы. З помніка строга пазірае чалавек з высокім ілбом. Ён нешта думае.

– Спачатку было вайсковае фота, пасьля памянялі... Які ён вайсковец? – ціха сказала Ніна.

– Я не ўяўляю яго вайскоўцам... – сказаў задуменна Адам. Паклаў сьціплыя лясныя кветкі побач са шкляной вазачкай. Сарваў кветкі раніцай, а не завялі. У вазачцы былі чырвоныя гвазьдзікі. Яшчэ раз зірнуў на фота. Чысты маладжавы твар, цьвёрды напружаны позірк. Гэты позірк ня надта любілі студэнты. Здавалася, гэты чалавек ведаў усё пра ўсіх – хто што думае, хто чаго баіцца. Сам нібыта нічога не баяўся. І сьмерці? Відаць, і сьмерці, калі так лёгка памёр. “Добры дзень завуць мяне Лаўрэн Міхайлавіч да дошкі пойдзе...” “Каго сёньня паклічаш да дошкі, Лаўрэн Міхайлавіч?”

Адам крыва ўсьміхнуўся.

– Ты чаго? – зьдзівілася Ніна.

– Так... Ты правільна сказала: ён быў добры настаўнік. Хаця і жорсткі.

Адам хуткім крокам пайшоў да машыны. Ніна ледзь пасьпявала за ім.

– Я цябе падвязу да дому?.. – ня то спытаў, ня то прапанаваў ён.

– Калі зойдзем да нас...

– Ня сёньня... – Адам пільным позіркам паглядзеў на Ніну, ёй аж зябка стала ад гэтага позірку. Напомніла:

– Ты так і не сказаў пра паліто...

– Пра паліто?.. Праўда, сумна разьвітацца. Але трэба. Даруй, я столькі забраў у цябе часу.

Ніна бачыла, што нешта іншае займае ягоную галаву, і, яна тут лішняя. Засьпяшалася гаварыць: баялася, што ён не даслухае яе, шчоўкне дзьверцамі машыны і паедзе.

– Што ты, Адам. Я так рада, што ты знайшоў мяне. – Голас яе дрогнуў, яна зьбівалася на сьлёзы, ён гэта адчуў і спыніўся. – Я хачу сказаць... – яна ўзяла яго за гузік кашулі, – калі табе будзе надта цяжка, і я чым-небудзь змагу памагчы, я гэта зраблю нягледзячы ні на што.

– Ты ўжо мне памагла, вельмі памагла.

Ён рыўком абшчапіў яе па руках, адхінуў ад сябе, доўга ўглядаўся ў вочы, потым прыцягнуў да сябе, груба і моцна пацалаваў і пайшоў да машыны. Зрабіў некалькі крокаў, спыніўся, павярнуўся да яе.

– Хачу папрасіць аб адным: калі-небудзь, калі мяне ня будзе, дваццаць шостага сакавіка купі букет гвазьдзікоў і пакладзі на яго магілу. – Сеў у машыну. Машына ірванулася з месца, як снарад, стрэліўшы густым шэрым дымам.

Ніна доўга глядзела ёй усьлед, потым ціха, як нехаця, пайшла па вуліцы, але ня ў бок свайго дому, а ў бок парку, знайшла лавачку на бакавой алеі, села і праседзела да цемнаты, аж пакуль нияркім сьвятлом не зачапіліся ліхтары.

“Чаго ён прыязджаў... Па ўсім, яму вельмі цяжка. Букет гвазьдзікоў... Чаму дваццаць шостага сакавіка? “Калі мяне ня будзе...” Калі яго ня будзе?..”

Вярнулася дамоў, калі яе мужчыны ўжо спалі. Адчыніла шуфлядку, дзе ляжалі старыя пісьмы, дакументы. Знайшла кніжачку, у якую запісвала

адрасы і тэлефоны аднакурсьнікаў. Побач з Адамавым прозьвішчам стаялі дзьве лічбы: 26. 3. Сакавік быў яго месяцам, а дваццаць шостае днём нараджэньня...

Было яшчэ відна, калі Адам выехаў з гораду. Ехаў як у сьне. Калі б нехта спыніў і спытаў, куды чалавек едзе – нічога талковага не сказаў бы. Ён проста ехаў.

Гэты дзень яго вельмі стаміў. Дзень – год ці болей. Выязджаў з дому, здавалася ўсё было вырашана. Ехаў разьвітацца... І як быццам разьвітаўся... Як быццам... Неаперабельная хадзячая лялька. Неаперабельная?..

Перад павароткай, дзе яго ледзь не раздушыў рэфрыжэратар, спыніўся. Шаша была як падмеценая, і нішто не нагадвала пра тое, што тут адбылося раніцой. Толькі там, дзе ляжаў зьбіты чалавек, засталася цёмная пляма. Пройдзе дождж – ня стане і яе.

Адам разьвярнуўся, як і на пачатку дня заехаў у лес. Што яму трэба было ў тым лесе, ён ня ведаў. Але нешта цёплае варухнулася ў грудзях, калі пазнаў месца, дзе стаяў раніцой. Тут яшчэ была вавёрка, яна скідвала на машыну шышкі... Відаць, ужо сьпіць, а шкада...

Спыніўся, заглушыў матор. Адчыніў “бардачок”, дастаў дарожную металічную біклажку. Там быў сьпірт. Адкруціў каўпачок, зрабіў некалькі глыткоў. Гарачы клубок апаліў горла, перахапіла дыханьне. З раніцы Адам нічога ня еў, і сьпірт адразу стукнуў у галаву, у грудзях пацяплела. У вушах пачулася музыка, быццам нехта іграў на цымбалах, ці то недзе званілі званы... Паклаў назад біклажку і ўбачыў сьцізорык у перламутравых тронках. Невялікі, на шырыню далоні. Удружыў яго Адаму бацька аднаго з вучняў, сьлесар з аўтазаводу. “Вазьміце, згадзіцца. У вас машына, у дарозе ўсякае бывае, ды і так. У мужчыны павінен быць нож”. Сапраўды, у дарозе нож патрэбны.

Адам узяў у руку сьцізорык, і ён нібы прыліп да яе – халодны, гладкі, ёмкі. Націснуў пальцам на непрыкметны выступ збоку тронка – з сярэдзіны выстраліў язычок стальнога ляза. Вузенькі, конусападобны, як скальпель. Націснуў яшчэ раз – язычок схаваўся. Націснуў зноў – язычок зноў выстраліў. Прыгожы, сінявата-белы, востры, як брытва. Адам правёў вастрыём па пальцы, пачакаў. На пальцы азначыліся цёмныя кропачкі. Быццам нехта маленькі прабег, пакінуўшы свае сьляды. Сьляды большалі, набракалі крывёй, але болю не было. Адам націснуў на выступ зноў – язычок зноў схаваўся. То была гульня: націснуў – адпусьціў, націснуў – адпусьціў... Гульня заварожвала, зацягвала. Асабліва гэтае лязо: выскачыць – схаваецца, выскачыць – схаваецца, туды-сюды, туды-сюды... Так выстрэльвае язычком зьмяя, калі яе патрывожаць.

Адам прыставіў сьцізорык да чорнай сьпінкі сядзеньня, націснуў на выступ. Лязо прашыла сьпінку, пакінуўшы тоненькую, як нітка, шчыліну. Адам правёў па ёй пальцам – шчыліна прапала. Чыстая глянцавая скура... Перавёў вочы на люстэрка. І ў люстрана-чорнай цемнаце ўбачыў вочы чужога чалавека. Чалавек ня то хацеў сьмяяцца, ня то плакаць. Адам падвёў да шыі сьцізорык, націснуў на выступ. Ля вуха шчоўкнула... Нейкі час Адам сядзеў, як бервяно, павярнуў сьцізорык туды-сюды, лязо бліснула затуманеным холадам. Крыві на ім не было. Адам застагнаў, кінуў сьцізорык у “бардачок”, ляснуў дзьверкай.

Нейкі час сядзеў нерухома, як мёртвы. Адплюшчыў вочы. Перад сабой у люстэркавай далі ўбачыў чалавека ў чорным адзеньні. Са сьвечкай у руках той набліжаўся з цемнаты. І чым болей ён набліжаўся, тым болей у ім угадваліся рысы некага вельмі знаёмага. Чалавек выходзіў з ценю, і Адам пазнаваў яго, – то ж быў ён сам, Адам...

...Прачнуўся ад цяжару: нешта цьвёрдае не давала дыхаць. Адкінуўся назад, павёў вачамі, але нічога ня ўбачыў –кругом было цёмна. Уключыў фары і падзівіўся: наперадзе, у размытым конусе сьвятла, як акамянелая варта, нерухома стаялі чорныя ствалы – елкі, сосны... З бакоў, куды сьвятло не даставала, варта падступала бліжэй, цясьней, зьбіваючыся ў суцэльную сьцяну. А між ствалоў цякла белая вада –павольнае мройнае варушэньне. Вада чамусьці ішла паверсе, не займаючы машыны, малых кустоў, буячніку. Дык гэта ж не вада! Гэта ранішні туман...

Аднекуль ззаду даносіўся глухі роўны гул. То падавала голас шаша. Ня надта ж далёка ён уцёк. Трэба ехаць...

Мужык прадаваў курэй...

*1987, 2007*